Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 31 1933 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 167 (4711)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Закрылася менская гарадзкая партканфэрэнцыя па якасьці гарбарна-абутковай прадукцыі

Учора на ранішнім пасяджэньні канфэрэнцыя заслухала даклады дырэктара менскай абутковай фабрыкі ІМЯ КАГАНОВІЧА тав. ШЭРМАНА аб якасьці абутку і сакратара партыйнага калектыву гарбарні «БАЛЬШАВІК» тав. ГЕЛЕРА аб партыйна-масавай рабоце і авангардной ролі камуністаў у барацьбе за якасьць прадукцыі.

З 12 гадзін канфэрэнцыя працавала па сэкцыях: гарбарнай, абутковай, сырцовай, скурана-галянтарэйнай і ўцільнай.

На вячэрнім пасяджэньні выступілі з прамовамі сакратар Менгаркому КП(б)Б тав. КУДЗЕЛЬКА і народны камісар лёгкай прамысловасьці БССР тав. ГРЫСЭВІЧ.

Канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыю, у якой занесла на чорную дошку паасобных бракаробаў фабрыкі імя Кагановіча і гарбарні «Бальшавік». Пастанову пераслала разгарнуць сацсаборніцтва паміж гарбарна-абутковымі прадпрыемствамі Менску і да XVI-й гадавіны Кастрычніцкай рэзалюцыі выпусьціць чырвоную кнігу спаборніцтва, арбітрам якога запрасіць ГК КП(б)Б.

Канфэрэнцыя пастанавіла прадставіць фабрыцы імя Кагановіча трохмесячны тэрмін для ліквідацыі свайго прарыву па якасьці прадукцыі, у супраціўным выпадку будзе пастаўлена пытаньне аб зьняцьці з яе ганаровай назвы імя Кагановіча.

Пасьля прыняцьця прывітальная тэлеграмы ЦК УсеКП(б) тав. СТАЛІНУ і адкрытага ліста ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО канфэрэнцыя закрылася.

1-га жніўня—усебеларускі чырвоны абоз са збожжам

ВА МНОГІХ РАЁНАХ РАЗГАРНУЛАСЯ МАСАВАЯ УБОРКА

Спалучыць уборку з арганізацыяй збожжаздачы дзяржаве

Склады, тару, вагі прывесьці ў баявую гатоўнасьць, культурна абслужыць здатчыкаў

Арганізаваць уборку, сваячасовую здачу, прыёмку і хаваньне збожжа

Сустрэць і ўбраць ураджай першай вясны другой пяцігодкі арганізавана, у максымальна кароткія тэрміны, добраякасна выканаць абавязацельствы перад дзяржавай — наша баявая задача.

У гэтым годзе, у адрозьненьне ад мінулых гадоў, з першых-жа дзён уборкі трэба ўзяць бальшавіцкі разьбег, максымальна-высокія тэмпы ў выкананьні плянаў здачы прадукцыі дзяржаве.

Выразная, правільная арганізацыя работы, такая расстаноўка сіл, каб ахапіць сваім уплывам ня толькі кожны саўгас, калгас, але і брыгаду і аднаасобнікаў. Прасунуць партыйныя сілы з раёну непасрэдна ў вёску, у калгас, брыгаду. На месцы разгарнуць палітычную масава-растлумачальную работу. Члены партыі на вёсцы нясуць поўную адказнасьць за такую арганізацыю работы ў калгасах, саўгасах, аднаасобным сэктары, каб не атрымалася разрыву пэміж уборкай і здачай прадукцыі дзяржаве.

Гэта акалічнасьць адначасова высоўвае ва ўвесь рост задачу сваячасова і найбольш дасканала падрыхтаваць усю матар'яльна-тэхнічную базу загатовак. Да прыёмкі прадукцыі павінны быць добра падрыхтаваны ўсе складзкія памяшканьні, элеватары, сушылкі, пляцоўкі для хаваньня, пад'язныя шляхі і г. д. Павінен быць скончан рамонт старых складаў, будаўніцтва новых, праведзена старанная дэзынфэкцыя ўсіх складачных памяшканьняў, павінен быць набыт вагавы інвэнтар, падабраны неабходныя праверныя кадры, арганізавана ахова, падрыхтаваны супроць пажарныя сродкі.

Такая падрыхтоўка павінна забясьпечыць, па-першае, хуткую прыёмку збожжа і, па-другое, зьнішчыць меўшыя месца вялікія страты і псаваньне прадукцыі пры прыёмцы і хаваньні, зьберагчы прадукцыю ад раскрадваньня.

Выключнае значэньне набывае пастаноўка дакладнага і апэрацыйнага ўліку збожжа зьнізу да верху. У калгасах павінны так арганізаваць работу, каб строга ўлічваўся кожны сноп, кожная капа, каб кожны кілёграм прадукцыі быў добра запрыходаван. Адначасова не абходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на справу набору праверaных і падрыхтаваных кадраў уліку і справаздачнасьці на прыёмачныя пункты. Правільны ўлік загатоўленага збожжа заўсёды меў, а ў гэтым годзе ўлік... вялізарнае значэньне. Зараз улік збожжа значна ўскладніўся. Ня трэба забываць, што ў гэтым годзе будзе асобна ўлічвацца збожжа, паступаючае ў парадку збожжапаставак, па натуралёнаце МТС, па звароце насенных пазык і па гарнцавым зборы.

Рашучы адпор трэба даць усякім спробам дыскрэдытаваць закон аб збожжапастаўках шляхам дачы сустрэчных заданьняў, што катэгарычна забаронена партыяй і ўрадам. Перасячы ў корані з самага пачатку спробы разпромленага, але яшчэ недабітага ворага сарваць уборку і збожжаздачу. Павесьці рашучую барацьбу з памочнікамі клясавых ворагаў, апартуністамі, якія хочуць пусьціць гэту важнейшую кампанію на «самацёк». Рашучы адпор павінны атрымаць апартуністы, якія ня хочуць сварыцца з клясавымі ворагамі і гніла-ліберальна адносяцца да парушальнікаў непахіснага закону аб збожжапастаўках, да антыдзяржаўных тэндэнцый.

Ці выконваюцца хоць-бы гэтыя, далёка ня поўнасьцю пералічаныя патрабаваньні на мясцох? Трэба сказаць, што ва многіх раёнах на выконваюцца.

Мы ўступілі ў паласу разгортваньня самых сур'ёзных работ — уборкі і збожжаздачы. Ужо зараз нам кожны дзень прыносіць новыя весткі аб тым, што калгасы раду раёнаў нашай рэспублікі разгарнулі ўборку і збожжаздачу. Перадовыя калгасы антыўваенны міжнародны дзень 1-га жніўня адзначаюць усебеларускім чырвоным абозам.

Аднак, матар'ялы, якія ёсьць у нашым распараджэньні, гавораць аб тым, што рад раённых арганізацый не ўзначаілі ініцыятывы і вытворчага энтузіязму калгасных мас ва ўборцы і здачы прадукцыі дзяржаве. Рад раёнаў, паўтарачы леташнюю практыку, усё яшчэ раскачваюцца, прычым раскачваюцца недапушчальна слаба. Яшчэ многа ёсьць фактаў балбатні, непатрэбных сходаў, пасяджэньняў і г. д., якія не даюць рэальнай карысьці, а толькі ўскладняюць работу па ўборцы і збожжапастаўках. Яшчэ далёка ня ўсюды расстаўлены сілы як раённых работнікаў, так і сельсаветаў, калгасаў, паселішч з такім разьлікам, каб добра вывучыць кожны ў паасобку калгас, брыгаду, мабілізаваўшы масы, арганізаваць бесьперабойны збожжавы канвэер з поля да малатарні, ад малатарні да элеватара і прыёмачнага пункту.

Зусім правільна т. т. Гікало, Галадзед і Ратнэк у сваёй тэлеграме ўказалі, што: «кіруючыя работнікі замест таго, каб быць у калгасах, сельсаветах, знаходзяцца ў раённых цэнтрах, праводзяць пленумы, шырокія нарады, у той час, як на важнейшых пытаньнях уборкі і збожжаздачы выявілася поўная непадрыхтаванасьць раду раёнаў, МТС, саўгасаў і сельсаветаў».

Папулярызацыя закону патрабуе разгортваньня палітычнай і арганізацыйнай работы ў масах, глыбокай растлумачальнай работы сярод усіх калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў. Трэба сказаць, што гэты бок работы ў радзе раёнаў ігнаруецца. Не ў пашане і справа пастаноўкі ўліку. У радзе месц не ўсьвядомілі, што магутная зброя барацьбы з раскрадваньнем — гэта ўлік. Неабходна арганізаваць такі ўлік, каб як у люстры адбіваўся штодзенны рух збожжа. Гэта адначасова дасьць магчымасьць мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў на справу кантролю за сваячасовай і добраякаснай, бяз страт, уборкай і здачай прадукцыі дзяржаве.

Недапушчальна слаба разгортваецца падрыхтоўка тэхнічнай базы. Не гатовы хавальні для сустрэчы збожжавага патоку. Чыноўнікі з сыстэмы Загатзбожжа на мясцох з благаславеньня некаторых раённых арганізацый, раўняючыся па тэмпах мінулага году, недапушчальна слаба падрыхтаваліся да прыёмкі збожжа. Недабудаваныя склады, неадрамантаваныя, непрадэзынфэкцыяваныя ссыпныя пункты, поўрасгураныя павеці для збожжа, адсутнасьць піраў, вагі, тары, недахват і малакваліфікаванасьць кадраў, асабліва па ўліку і справаздачнасьці, плюс нелаваротлівасьць і нераспарадчасьць апэрацыйных і складзкіх работнікаў,—вось атэстат работы многіх аддзяленьняў Загатзбожжа.

Сказанае лёгка пацьвердзіць на факце прыёмкі сена. Доўгія чаргі фурманак з сенам вакол прыёмачных пунктаў, марныя пошукі калгасьнікамі прыёмшчыкаў [illegible] — вось сумны малюнак работы пасасобных прыёмачных пунктаў.

Пара пакончыць з гэтай супакоенасьцю. Пытаньне вырашаюць літаральна гадзіны. Кожны элеватар, кожны прыёмачны пункт павінен ужо зараз быць гатовым бяз усякіх перабояў, бяз страт і чаргі прымаць збожжа. Гэтыя пункты, дзе сканцэнтроўваюцца калгасьнікі, трэба ператварыць у ачаг культурнай работы. На вучастак падрыхтоўкі тэхнічнай базы павінна быць накіравана сур'ёзная ўвага партыйных арганізацый.

Шматлікія матар'ялы, зьмешчаныя на старонках нашай газэты аб фактах антыдзяржаўных тэндэнцый, гавораць аб тым, што ў радзе раённых арганізацый маюць месца факты прытупленьня клясавай пільнасьці, што ня ўюды зжыты апартуністычныя, гніла-ліберальныя адносіны да загатовак. Трэба рашуча біць па ўтойшчыках ураджаю. Партыя патрабуе «рашучага адпору ўсякага роду месьнічкім антыдзяржаўным спробам да ўтойваньня ўраджаю, кімбы гэтыя антыдзяржаўныя імкненьні не дапускаліся» (з пастановы СНК і ЦК УсеКП(б)

Адным з манэўраў клясавага ворага, накіраваных на дыскрэдытацыю новага закону, зьяўляецца давядзеньне сустрэчных плянаў да калгасаў і аднаасобнікаў.

У пастанове СНК СССР і ЦК УсеКП(б) дана сур'ёзнае папярэджаньне: «Забараніць усім без выключэньня органам улады, у тым ліку і загатоўчым арганізацыям, устанаўляць для калгасаў і аднаасобных гаспадарак сустрэчныя пляны збожжапаставак і папярэдзіць усе партыйныя і савецкія арганізацыі, што асобы, вінаватыя ў дачы сустрэчных плянаў, будуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасьці».

Партыя недазволіць усякім злачынным элементам парушаць законы пралетарскай дзяржавы, законы, якія накіраваны да ўмацаваньня і поўнай перамогі калгаснага ладу, да таго, каб зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгасьнікаў заможнымі.

ПА БССР ЗЖАТА 6.826 ГА АЗІМЫХ

Па даных НКЗБ на 25 ліпеня па 27-мі раёнах БССР зжата 6.826 га азімага жыта. У тым ліку: саўгасамі зжата 55 га, калгасамі — 3.782 га і аднаасобнікамі — 2.989 га.

ЦК КП(б)Б—т. Гікало, СНК БССР—т. Галадзеду, Палітсэктар НКЗБ—т. Ратнэку

27 ліпеня плян здачы сена калгасамі Мсьціслаўскай МТС выкананы на 118 проц. Па кантрактацыйных дагаворах падлягала здачы 138 тон, фактычна здана 183 тоны.

Дырэктар МТС НІКІФАРАЎ.
Нач. палітаддзелу ВАРУШЫЛАЎ.

ЦК КП(б)Б, СНК БССР, „ЗЬВЯЗЬДЗЕ"

КАМАРЫН. (Па тэлеграфу).

У выніку пасьпаховага правядзеньня масава-растлумачальнай работы, камарынская партарганізацыя прышла да VIII пленуму РК з наступнымі паказальнікамі: убрана азімых і раньніх яравых 65 проц., у гонар пленуму 29 ліпеня здана 10 тон збожжа новага ўраджаю. 1 жніўня арганізуем масавы чырвоны абоз са збожжам і сенам.

Сакратар РК КП(б)Б КАВАЛЕЎ.
Старшыня РВК ВОЛКАЎ.

ПЕРШЫ ХЛЕБ — ДЗЯРЖАВЕ.

НА ЗДЫМКУ: Чырвоны караван каля складу Загатзбожжа (Баку), які прывёз каля 3 тысяч цэнтнэраў пшаніцы і ячменю першага абмалоту.

1-га жніўня здаем 50 проц. збожжавых

ЕЛЬСК. (Наш кар.). Калгас «ХЗЬЕЗД САВЕТАЎ БЕЛАРУСІ» першым у БССР пачаў звышраньнюю слэбу. Зараз ён не здае тэмпаў і на фронце ўборачнай. Ужо зжата 50 га ячменю. КАЛГАСЬНІКІ ПАСТАНАВІЛІ 30 ЛІПЕНЯ АДВЕЗЬЦІ ПЕРШЫ АБМАЛОТ НА ПРЫЁМАЧНЫ ПУНКТ, А 1 ЖНІЎНЯ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ЗБОЖЖАПАСТАВАК НЯ МЕНШ ЯК НА 50 ПРОЦ.

Калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі Санюкоўскага сельсавету таксама актыўна рыхтуюцца да першажнівеньскага абозу.

На мітынгу ў Меляшкоўскім сельсавеце, які праводзіўся ў сувязі з падрыхтоўкай да першажнівеньскага чырвонага абозу, 23 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі падалі заяву аб уступленьні ў калгас.

Працоўныя аднаасобнікі немцы Розэ-Люксэмбурскага сельсавету, у адказ на паклёпы германскіх фашыстаў арганізавалі чырвоны абоз з сенам. Здана каля 8 тон.

Адначасова трэба адзначыць, што ў радзе калгасаў замест таго, каб з першых абмалотаў пачаць здачу збожжа дзяржаве, праводзяць кулацкую палітыку — «спачатку сабе». Так, старшыні калгасаў «ПРЫКЛАД» і «КАМУНІСТ» першы абмалот у колькасьці 38 пудоў ячменю падзялілі паміж сабой. Такую-ж кулацкую лінію заняў і старшыня калгасу «БАЛЬШАВІК» Міксюк. Аднак, гэтыя антыдзяржаўныя тэндэнцыі з боку мясцовых арганізацый не атрымалі рашучага адпору, вінаватыя ня прыцягваюцца да адказнасьці.

ЕЛЬСКІ.

Дзесяткі тысяч тон збожжа не забясьпечаны складзкімі памяшканьнямі

ВОРША. (Наш кар.). Аршанская міжраённая кантора Загатзбожжа абслугоўвае і забясьпечвае складзкімі памяшканьнямі 8 раёнаў. Апрача таго ў Воршы ёсьць элеватар усесаюзнага значэньня.

Першыя дні прыёмкі сена паказалі, што кантора не падрыхтавалася да загатовак. Нізкая кваліфікацыя работнікаў і адсутнасьць кантролю за якасьцю пры маемай прадукцыі прывялі да таго, што на раённых пунктах пачало паступаць сена нізкай якасьці. Так, у Горацкім пункце (загадчык Стаўскі) і ў Цёмным лесе (загадчык пункту Навіцкі) прымалі мокрае, балотнае сена. З другога боку, ёсьць факты, калі гэтай кулацкай рабоце патураюць і некаторыя раённыя работнікі. Напрыклад, намесьнік старшыні Лепельскага РВК Няхаеў прымушаў работнікаў загатзбожжа прымаць сена з вільготнасьцю больш за 20 проц. У результаце на базе такога сена сабралася цэлая сьцірта ў 100 тон і яно пачало гарэць.

Аршанская кантора ня прымае таксама належных мер, каб пасьпяшаць тым, пы загатовак сена. Паводле апошніх даных плян сеназдачы ўсімі пунктамі выкананы на 50 проц.

Прыблізна на 10.000 тон не хапае складзкіх памяшканьняў. Толькі па адным Багушэўскім пункце складзкіх памяшканьняў не хапае на 1.500 тон.

Ясна, што ў гэтым вінаваты непасрэдныя кіраўнікі кантор і загадчык міжраённай канторы тав. Пацёмкін. Аднак, трэба сказаць, што самі раённыя пункты не праяўляюць ініцыятывы, каб адшукаць памяшканьні. Так, пры Багушэўскім ільназаводзе (Аршанскі раён) ёсьць склады на 8.000 тон хлеба, якія заводам да лістапада месяца ня будуць выкарыстоўвацца. 15 ліпеня Аршанскі РВК вынес пастанову, паводле якой палова складаў заводу павінна быць прадастаўлена Загатзбожжу. Рэалізацыя гэтай пастановы ўскладзена на намесьніка старшыні РВК тав. Лабзакова. Аднак, яшчэ і да сёньняшняга дня гэта пытаньне ня вырашана. Пустуюць таксама і склады «Саюзхлеба» ёмістасьцю ў 500 тон, але ў раёне на гэта не зварачаюць увагі. Раённыя работнікі Аршанчыны разважаюць так: «Мы свой хлеб маем дзе ссыпаць, а аб другіх раёнах клапаціцца нам няма патрэбы». Гэтыя месьнікіцкія тэндэнцыі павінны быць неадкладна зжыты і атрымаць рашучы адпор

Зусім недапушчальна стаіць справа з падрыхтоўкай тары. Не хапае каля 50.000 мяшкоў. Аказваецца, што мяшкі яшчэ ў мінулым годзе райадзяленьнем «Саюзмукі» былі пазычаны розным арганізацыям і ўстановам (ТПО, Асіяторф і інш.). Аднак, усе мяшкі зараз вярнуць нельга, бо ў загатоўчых арганізацыях не захавана ніякіх дакумантаў.

Кантора Загатзбожжа ўсё яшчэ толькі маркуе пастаўць гучнагаварыцель. А аршанскі райспажыўсаюз і Белгендаль толькі цяпер успомнілі, што трэба арганізаваць пры элеватары ларкі і чайныя.

Вось як апаратчыкі аршанскай міжраённай канторы рыхтуюцца да сустрэчы чырвоных абозаў з новым ураджаем.

В. Д.

СПАБОРНІЦТВА НА АТРЫМАНЬНЕ ПЕРШЫХ 100 КВІТКОЎ

МАГІЛЕЎ.

Ва ўсіх калгасах раёну разгарнулася падрыхтоўка да міжнароднага чырвонага дня — 1-га жніўня. Гэты дзень адзначаецца чырвоным абозамі са збожжам новага ўраджаю.

Калгас імя Леніна, Чырвонапольскага сельсавету зьвярнуўся з лістом да ўсіх калгасаў раёну аб арганізацыі спаборніцтва на хутчэйшую здачу збожжа дзяржаве.

Па ініцыятыве калгасу імя Леніна ў раёне абвешчана спаборніцтва на атрыманьне першых 100 квіткоў па здачы збожжа. У спаборніцтва ўключылася ўжо звыш 30 калгасаў.

Спаборніцтва праходзіць пад лёзун гам — да 1-га верасьня выканаць увесь плян збожжазагатовак.

ЗАКРЫТЫМІ ДЗЬВЯРЫМА СУСТРЭЛІ ЧЫРВОНЫ АБОЗ

БЯГОМЛЬ. 30 ліпеня калгас «ВОЛЬНАЕ ЖЫЦЬЦЁ» прывёз проста з-пад малатарні чырвоным абозам адну тону збожжа новага ўраджаю. Між тым, склад у БРОДАХ не гатоў да прыёмкі. Няма людзей, тары, вагі, пад'язны шлях да складу і дарога знаходзяцца ў недапушчальным становішчы. Гэтыя прычыны ставяць пад яўную пагрозу зрыву пасьпаховы ход прыёмкі збожжа ад калгасаў.

БАРАЎКОЎ.

Па-ўдарнаму рыхтуюцца да першажнівеньскага чырвонага абозу

ЕЛЬСК. (Наш кар.).

Калгасьнікі і перадавыя аднаасобнікі Ельшчыны разгарнулі шырокую падрыхтоўку да першажнівеньскага чырвонага абозу. У калгасах «Чырвоны Ельск», «Чырвоны араты», «Шлях рэвалюцыі», «Чырвоная зара» па-ўдарнаму праводзіцца абмалот.

Райспажыўсаюз арганізаваў пры прыёмачным пункце чайную, ларок, кіёск з газэтамі і кнігамі для абслугоўваньня збожжаздатчыкаў.

23 ліпеня праведзена раённая нарада рэдактароў насьцегазэт і кіраўнікоў груп садзейнасьці РСІ па пытаньні аб падрыхтоўцы да першажнівеньскага чырвонага абозу і праверцы якасьці палявых работ.

У дзень работы нарады калгас «Чырвоны араты» здаў дзяржаве 721 кгр. ячменю новага ўраджаю.

Ельскі.

У тыле сенаўборкі

УВАРАВІЧЫ, 28. (БЕЛТА).

Па раёну скошана натуральных сенажацяй 18 проц. і ўбрана 11 проц. Па калгасах скошана 35 проц., убрана 23,5 проц.; па аднаасобным сэктары скошана толькі 5 проц., а ўбрана 2,7 проц.

Адставаньне з сенаўборкай — вынік бязьдзейнасьці старшынь калгасаў, сельсаветаў, брыгадзіраў, наўмыснага ня нежаданьня арганізаваць работу.

У калгасе «Ч. Плошча» (старшыня калгасу Капальчык, сакратар парт'ячэйкі Цімаховіч) калгасьнікі ня выходзяць на работу, а ходзяць у лес... зьбіраць ягады. Брыгадзір Дуброўскі і праўленьне калгасу ня прымаюць ніякіх мер для барацьбы з прагулышчыкамі і лодырамі. Нявыхад на працу жанчын па калгасу дасягае 40 проц.

У калгасе 9 камуністаў, але з іх непасрэдна на вытворчасьці знаходзіцца толькі тры.

Праўленьне калгасу і парт'ячэйка не перанесьлі вопыту брыгады камуніста Клімава, у якой касцы і жанчыны разьбіты на групы, спаборнічаюць паміж сабой і перавыкопваюць норму працы.

Камуна „Іскра"— да 1 жніўня

ШКЛОЎ.

Інтэрнацыянальная сельска-гаспадарчая камуна «Іскра», Рыжкаўскага сельсавету, рыхтуецца па-ўдарнаму да першажнівеньскага чырвонага абозу. Камунары абвясьцілі сябе мабілізаванымі на лепшае праведзеньне ўборкі і першачарговае выкананьне абавязкаў па здачы прадукцыі дзяржаве.

Камуна «Іскра» выклікала на сацспаборніцтва па арганізацыі першажнівеньскага чырвонага абозу ўсе калгасы Рыжкаўскага сельсавету.

М. К.

У ГОРКАХ НЕ ГАТОВЫ ДА ПРЫЁМКІ НОВАГА ЎРАДЖАЮ

Большасьць складаў горацкіх загатоўчых арганізацый знаходзяцца ў горадзе. На станцыі ёсьць толькі адна сяённая база Загатзбожжа і невялічкі склад Белплодагароднінны. Загатлён толькі цяпер выбраў месца для пабудовы сваёй базы на станцыі, але калі яна будзе гатова — невядома нават і кіраўнікам канторы.

Склады Загатільну зусім не падрыхтаваны і зараз завалены ільнапрадукцыяй мінулага году. Каля 70 проц. загатоўленага ільну 8-га і 6-та нумароў ляжаць на складах і ў глыбінных пунктах. Склады ільназаводу таксама загружаны пераапрацаванай прадукцыяй. Такім чынам для прадукцыі новага ўраджаю не забясьпечана патрэбная складская плошча.

Кантора Белплодагароднінны толькі зараз пачала рамантаваць склады. Толькі цяпер выявілася, што не хапае на ўсю прадукцыю складаў і частку яе прыдзецца захоўваць у капцох.

Два склады канторы Загатзбожжа таксама яшчэ не адрамантаваны. Дах цэнтральнага складу ў трох мясцох працякае. Прычым да яго зроблена дашчатая прыбудоўка, што пагражае пажарам. Трэці склад Загатзбожжа цалкам загружан пасенным жытам. Вось малюнак падрыхтоўкі складзкіх памяшканьняў загатоўчых арганізацый.

Гэтыя склады таксама не забясьпечаны патрэбным інвэнтаром. Ёсьць адна арфа, дый тая сапсаваная. А трэба ня менш 6 арфаў, 2 зьмейкі і 2 трыеры. На жаль, усяго гэтага няма. Мала і апратушыцеляў. З 12 штук апратушыцеляў, якія ёсьць, ні адзін не праверан. Не хапае каля 7.000 мяшкоў. Канторай Загатзбожжа да гэтага часу нават не праведзена пашпартызацыя складаў, вагі не праверены і ня клеймены.

Тое-ж самае трэба сказаць і аб складах Загатільну. Кіраўнікі Загатільну далі заяўку на высылку ім шчупаў, плёмбіраў, плёмб брэзэнту, шпагату, бірак, пашпартоў і на гэтым супакоіліся. Пакуль што ні па аднаму прадмету заяўка ня выканана.

Склады Белплодагароднінны больш менш здавальняюча забясьпечаны бочкамі і камплектамі скрынак. Але ўся гэта тара валяецца пад навесьцю, расыхаецца і раскрадваецца. Улік і ахова тары не вядзецца. Апрача таго канторы не хапае 2.000 штук мяшкоў і 1 тоны цьвікоў. Няма пакавальнай паперы, кошыкаў і інш. Засолачны пункты зусім не падрыхтаваны. Не загатоўлены і матар'ялы для засолкі (лаўровы ліст і інш.), нават такога прадукту, як соль, не хапае больш 6 тон.

Апарат горацкіх загатоўчых арганізацый засьмечан клясава-чужымі элементамі. Так, загадчыкам галоўнага складу Белплодагароднінны працуе Гладкі, які растраціў 2.445 рублёў дзяржаўных грошай. У апараце Загатільну арудуюць былыя гандляры. Загадчык горацкага пункту былы гандляр Шэвелеў, загадчыкамі любіскага і дрыбінскага пунктаў працуюць былыя скупшчыкі ільну браты Пэўанэры. На пасадах сартавальшчыкаў таксама працуюць былыя гандляры. Рахункаводамі вылучаны слаба кваліфікаваныя работнікі. Наогул пры наборы работнікаў у загатоўчыя арганізацыі не праводзіцца праверка іх сацыяльнага становішча.

Факты гэтыя паказваюць, што ў Горках мала думаюць аб пасьпяховым правядзеньні загатоўчай кампаніі. Загатоўчыя арганізацыі не падрыхтаваны да бесьперабойнай прыёмкі с.-г. прадукцыі. Урокі мінулага году, калі раён увесь час знаходзіўся на чорнай дошцы, ня ўлічаны. У загатоўчых арганізацыях пануе бюракратызм і недаацэнка палітычнай важнасьці загатовак. РК КП(б)Б павінен тэрмінова прыняць меры і забясьпечыць бесьперабойную прыёмку с.-г. прадукцыі новага ўраджаю, ачысьціўшы апарат загатоўчых арганізацый ад апартуністаў і чужых элементаў.

Х. ЧАРНУХІН.
Н. ШЭЎЧЫК.

ПЕРШЫЯ АБМАЛОТЫ—ДЗЯРЖАВЕ

МАЗЫР. (Наш кар.). У раёне пачалася масавая ўборка азімага жыта і ячменю. Першымі пачалі жніво калгасы Зеляноцкага сельсавету. Усяго зжата 70 га. Калгасы «КАМІНТЭРН» і «ЧЫРВОНЫ ЖЫВЁЛАВОД» пачалі малацьбу. Мясцовымі арганізацыямі сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў разгорнута шырокая масавая работа пад лёзунгам «УБРАЦЬ УРАДЖАЙ БЯЗ СТРАТ, ВЫКАНАЦЬ ДАТЭРМІНОВА АБАВЯЗКІ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ, КАБ ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА НА МЕСЦА НА ЧЫРВОНАЙ ДОШЦЫ». КАЛГАСЬНІКІ І АДНААСОБНІКІ ГЭТАГА СЕЛЬСАВЕТУ АБАВЯЗАЛІСЯ ЗДАЦЬ 1-ГА ЖНІЎНЯ ЧЫРВОНЫМ АБОЗАМ 150 ЦЭНТНЭРАЎ ЗБОЖЖА. Адзін калгас «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ», Беразоўскага сельсавету, здае дзяржаве 2 тоны збожжа.

У сельсаветы раённымі арганізацыямі накіраваны прадстаўнікі па арганізацыі першажнівеньскага чырвонага абозу.

Мачальскі.

***

ЧАЧЭРСК. Калгас «Чырвоны араты» першым у раёне здаў дзяржаве 1.223 кгр. збожжа. Першага жніўня калгас арганізуе чырвоны абоз са збожжам.

СКАДАЎШЧЫНА Ў БЕШАНКОВІЧАХ

БЕШАНКОВІЧЫ, 30. (Маланка ад наш. спэцкора).

У раёне дапушчана грубейшае злачыннае скажэньне закону аб цьвёрдых пастаўках збожжа.

Райземаддзел у парадку сустрэчных плянаў з ведама раённага кіраўніцтва павялічыў заданьні па здачы жыта для ўсіх калгасаў на 10 проц.

Падрабязнасьці ў наступным нумары.

МІКУЦКІ.

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмешчаная вышэй тэлеграма нашага спэцкора сьведчыць аб тым, што ў Бешанковіцкім раёне па віне раённых кіраўнічоў злачынна парушан закон партыі і ўраду аб цьвёрдых пастаўках збожжа. Замест няўхільнага праведзеньня гэтага закону, які зьяўляецца непарушным і незьменным, райземаддзел з ведама раённага кіраўніцтва праводзіць кулацкую палітыку, накіраваную на падрыў давер'я мас калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў да закону аб збожжапастаўках.

Адпаведныя органы павінны тэрміновэ заняцца гэтай справай і прыцягнуць вінаватых да найстражэйшай адказнасьці.

ЯКАСЬЦЬ ЗБОЖЖА ВЫЗНАЧАЮЦЬ НА ЗУБ І НА ВОКА

ХОЙНІКІ. За апошнія два тыдні хойніцкі загатпункт правёў значную работу па падрыхтоўцы да прыёмкі новага ўраджаю. Едучы пеэам па дарозе да чыгункі, на дрэвах можна сустрэць дошчачкі, якія ўказваюць напрамак да загатпункту. Для абслугоўваньня здатчыкаў каля пункту выкапана студня і зроблена адпаведнае абсталяваньне для вадапою. Арганізавана культбаза на 300 асоб, упрыгожаная пёзунгамі, плякатамі. Ёсьць чытальня, кніжны кіёск. Райкомам партыі выпучан спэцыяльны культработнік т. Рабоўскі, які праводзіць гутэркі са здатчыкамі па пытаньнях бягучай палітыкі. Каля базы знаходзяцца дзьве разьліковыя касы. Тут-жа побач разьмешчан пункт ашчадкасы, дзе здатчыкі правяраюць выйгрышы па аблігацыях і атрымліваюць грошы. Насупроць чытальні — буфэт і чайная, заля якой радыёфікавана. На сьцяне вісіць вялікая дошка, якая паказвае ход спаборніцтва паміж сельсаветамі і калгасамі на хутчэйшае выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Першае месца пакуль што займае калгас «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ». Ёсьць стол даведак, дзе калгасьнікі і сяляне атрымліваюць адказы на пытаньні, якія іх цікавяць. Пры базе ёсьць кузьня, якая абслугоўвае здатчыкаў. Наогул, культурнае абслугоўваньне пастаўлена ўзорна.

Аднак, гэтага нельга сказаць аб укамплектаваньні пункту кваліфікаванымі работнікамі і тэхнічным абсталяваньнем. Прыёмшчыкі пункту нізкай кваліфікацыі. Для вызначэньня якасьці збожжа адсутнічаюць неабходныя прылады і інструманты. ЯКАСЬЦЬ ЗБОЖЖА ВЫЗНАЧАЕЦЦА ЗУБАМ І ВОКАМ. Рахункаводы таксама без адпаведнай практычнай падрыхтоўкі. Усё гэта ставіць пад пагрозу нармальны ход уліку і разьлік са здатчыкамі.

Трэба адзначыць, што з боку рэчыцкай міжраённай канторы адсутнічае дапамога і патрэбнае кіраўніцтва. Загадчык міжраённай канторы т. ІВАНОЎ ня раз абяцаў Хойніцкаму РК і РВК ліквідаваць недахопы, якія ёсьць на загатоўчым пункце. Але гэтыя абяцаньні ні засталіся абяцаньнямі.

Брыгада «Зьвязды» і «Калгасьніка Беларусі»: ДАШКЕВІЧ, МАЛЕВІЧ.

Аб ходзе масавай уборкі па Менскаму раёну

Пастанова Менгаркому КП(б)Б

1. Адзначыць, што ня гледзячы на вусім ясныя дырэктывы ГК КП(б)Б і гарсавету аб тым, што масавая ўборка азімых збожжавых павінна пачынацца з 29-30 ліпеня, партыйныя ячэйкі, упаўнаважаныя ГК КП(б)Б замест мабілізацыі калгасьнікаў і аднаасобнікаў на выкананьне гэтай дырэктывы (цэлы рад упаўнаважаных ГК і гарсавету) не праводзяць гэтых дырэктыў у жыцьцё. Так, напрыклад, у Грычынскім сельсавеце ўпаўнаважаны ГК т. ЕЛЯНЕЎСКІ — член прэзыдыуму гарсавету — склікаў партыйны сход ячэйкі, на якім была прынята пастанова — пачаць масавую ўборку 30-31 ліпеня, чым дэмабілізаваў партыйную ячэйку і калгасьнікаў, таксама самавольна выехаў з сельсавету, за што т. Елянеўскаму абвясьцілі вымову.

2. Прапанаваць т. Елянеўскаму неадкладна выехаць у сельсавет і забясьпечыць уборку азімых ва ўстаноўлены тэрмін.

3. Прыняць да ведама, што начальнікам палітаддзелу 1-ай МТС тав. Плятнёвым накладзена дысцыплінарнае спагнаньне за ігнаранма, які абслугоўвае Грычынскі сельсавет, за няправільную інфармацыю аб пасьпяваньні азімых.

4. У Падгайскім сельсавеце ўпаўнаважаны ГК КП(б)Б тав. ТАРАСАЎ замест таго, каб пачаць масавую ўборку азімага жыта, 29 ліпеня склікаў нараду ўсіх старшынь калгасаў, чым адарваў іх ад работы і парушыў пастанову ЦК, СНК і ГК КП(б)Б аб забароне скліканьня розных нарад у часе ўборачнай кампаніі, за што абвясьціць яму вымову.

5. Адзначыць, што выяжджаючыя ўпаўнаважаныя ў раён дзейнасьці МТС (Гатава, Нова-Дворскі сельсавет) не ўзгадняюць сваіх дзеяньняў з начальнікамі палітаддзелаў. Папярэдзіць усіх таварышоў, якія выяжджаюць у раён дзейнасьці МТС як упаўнаважанымі, так і па лініі шафскіх арганізацый, што ўсе свае дзеяньні яны павінны ўзгадняць з адпаведным нач. палітаддзелу.

6. Даручыць т. т. КАРАНЕЎСКАМУ і ШАПІРА парагледзець склад упаўнаважаных, якія пасланы ў сельсаветы, і пастаўіць пытаньне аб адкліканьні тых, якія не забясьпечылі мабілізацыі калгасьнікаў і аднаасобнікаў на масавую ўборку згодна пастановы ГК КП(б)Б — 29-30 ліпеня.

7. Лічыць неабходным, каб у асноўным увесь апарат ГК і гарсавету ў часе ўборачнай кампаніі знаходзіўся на вёсцы.

8. Адзначыць, што ў радзе саўгасаў, ня гледзячы на тое, што цэлы рад вучасткаў азімага жыта ўжо высьпеў, яшчэ не прыступілі да ўборкі, — прапанаваць ГК КП(б)Б праверыць і неадкладна арганізаваць уборку. Аб вінаватых у несвалачасовай уборцы паведаміць тэрміново ў

ЛІСТОК ЦКК НК РСІ БССР

НЯ КОЛЬКАСЬЦЮ ВЫНЕСЕНЫХ РЭЗАЛЮЦЫЙ І ЗАГАДАЎ, А ПРАКТЫЧНЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ ТРАНФІНПЛЯНУ, БАЛЬШАВІЦКАЙ СУСТРЭЧАЙ І ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК АЦЭНЬВАЮЦЦА ПОСЬПЕХІ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ПАСТАНОЎ СНК СССР І ЦК УсеКП(б) АБ ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРЦЕ

Славесная дэкларацыйнасьць і рэчаіснасьць

— Гомельскі эксплёатацыйны раён Заходніх чыгунак ужо закончыў перабудову работы — у гэтым запэўніваў намесьнік партарганізатара раёну Астапенка.

Як-жа на справе?

На справе малюнак зусім іншы.

Такая адказнейшая работа, як перагляд норм выпрацоўкі фактычна яшчэ не пачалася (акрамя вагоннага дэпо і станцыі Гомель). Па службе пуці, сувязі, жыльёвай дыстанцыі да гэтай работы нават ня прыступалі.

Такое становішча і з перабудовай зарплаты. З 1-га жніўня аплата работнікаў эксплёатацыі павінна праводзіцца па-новаму, а 26 яшчэ за гэту работу не браліся.

Характэрна, што дырэкцыя заходніх чыгунак прыслала тарыфныя стаўкі, паводле якіх раду кваліфікаваных работнікаў прадугледжана... зьніжэньне зарплаты. Так, наглядчыку будынкаў (на жыльёвай дыстанцыі) вызначаны 191 рубель у той час, як раней ён атрымліваў 196 руб., дзесятніку 66 руб. 30 кап., а раней ён атрымліваў 135 руб. Няправільнасьць такіх ставак зусім відавочна.

Па раёну не распачыналася яшчэ і атэстацыйная работа. Яе тут рашылі зусім не праводзіць.

— Бачыце, — тлумачыць нахабна намесьнік парторга **Астапенка**, — мы яшчэ раней чым была апублікавана пастанова СНК і ЦК правялі пераатэставаньне работнікаў, так што зараз яшчэ раз ня будзем гэта праводзіць. Гэты адказ зьяўляецца абураючым фактам бюракратычных, чыноўніцкіх адносін да перабудовы, па які павінна неадкладна рэагаваць партарганізацыя.

Пастанова партыі і ўраду аказалася для Гомельскага райкіраўніцтва не выстарчальнай. Як відаць, для яго вышэй свой гонар. Ці ня ясна, што тут проста злачынае ігнараваньне важнейшых указаньняў партыі і ўраду. Засьмечанасьць клясава-варожымі элемэнтамі гаспадарчых апаратаў і вытворчасьці надзвычай вялікая. Даволі толькі прывесьці адзін факт, каб у гэтым пераканацца. У 26 рамонтнай пуцявой калёне да апошняга часу цярпелі раскулачаныя — **Карцелёў, Вандрыкаў, Клімаў, Войкаў** і інш.

Зусім ня дзіва, што гэта брыгада выконвала ніяк сутачнай работы ня больш чым на 50 проц. Парторг брыгады **Пасароў** ня толькі ня выкрыў гэты кулацкі «букет», але фактычна пакрывай іх.

Трэба сказаць, што ў радзе месц партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не ўзначаліў бальшавіцкай барацьбы за перабудову транспарту.

«Зьвязда» пісала пра Гомельскі райпрафсаюз і яго старшыню **Грыбанава**, які ня толькі не ўзначаліў творчага ўздыму мас і ня ўключыўся ў перабудову, але сабатаваў яе. Сёньня да гэтага факту можна дадаць новую, выключна абураючую акалічнасьць.

Аказваецца Грыбанаў, той самы, які разбурыў прафсаюзную работу, які сабатаваў рэалізацыю пастаноў СНК і ЦК, у самы разгар перабудовы, вярнуўшыся з «дзелавой» паездкі ў Маскву за аўтамабілем, выехаў... у водпуск, на курорт.

Грыбанаў ня дурак, ён адчуў, што глеба пад нагамі гарыць і рашыў, якімі-небудзь мерамі іх убраць «па дабру па здарову». Знайшліся «сердабольныя» людзі — прадстаўнік дарпрафсаюзу **Глушанаў** і прадстаўнік ад партарганізатара дарогі **Белазерскі**, якія далі простае ўказаньне фракцыі райпрафсаюзу адпусьціць яго ў адпачынак. Грыбанаву гэта толькі і трэба было. Ён адразу выехаў, нават не здаўшы нікому справаў.

Партыйнае кіраўніцтва раёну ў вялікай ступені вінавата ў гэтай справе, яно ня здолела па-бальшавіцку выкрыць усе гэтыя махінацыі, узьняць гэту справу на бальшавіцкую прынцыповую вышыню.

Некаторыя сакратары цэхавых парт'ячэек і старшыні МК (**Тарасевіч, Сак, Лайко, Бандарэнка** і іншыя) ігнаравалі практычную рэалізацыю пастаноў, пляліся ў хвасьце мас, не сталі баявымі арганізатарамі іх на барацьбу за сапраўдную перабудову.

Як вядома, змазчыкі — цэнтральная фігура аздараўленьня вагонаў і таму ўвага да іх павінна быць значна ўзмоцнена. У гомельскім-жа раёне да апошняга часу адносіны да абслугоўваньня змазчыкаў проста шкодніцкія. Даволі сказаць, што для змазчыкаў, якія чакаюць цягнікоў, няма пакою да адпачынку, што яны вымушаны спаць на падлозе ў памяшканьні кандуктарскіх брыгад, што належачая ім спецвопратка — бразэнтавыя плашчы — не выдаецца. Дзе-ж тут выкананьне пастановы СНК і ЦК аб увазе змазчыкам?

Не праведзена яшчэ і поўнае разьмеркаваньне інжынэрна-тэхнічных работнікаў па лініі. Зараз знаходзяцца ў адпачынку 23 тэхнікаў-практыкантаў, экзаменістаў і інструктароў. Іх раённае кіраўніцтва нікуды не прызначала, мяркуючы, мусіць, што да часу звароту стане «крыху спакайней», тады можа ўдасца і пакінуць іх у сваім апараце.

Большасьць рахунковых работнікаў ня выехала на лінію. Ды іх ніхто і не пасылаў. З 59 чал. канторскіх работнікаў паслана ў вязьвы гаспадарчыя адзінкі толькі 7, 17 накінута ў апараце, 12 звольнена нібыта таму, што працы для іх няма, а 23 усё яшчэ «працуюць у ліквідкоме».

Да ўсяго прыведзенага трэба дадаць, што работа, мэтады кіраўніцтва засталіся да апошніх дзён старыя. Інструктары раённага кіраўніцтва яшчэ ні разу не выяжджалі на месцы для жывога інструктажу, дапамогі, для праверкі выкананьня ўказаньняў партыі і ўраду.

Пасьля ўсяго прыведзенага запэўненьні намесьніка парторга **Астапенка** аб праведзенай перабудове гучаць знаёмай славесчай дэкларацыйнасьцю, апартуністычных самазаспакаеньнем і злачынным шкодніцкім «очковтирательством».

А. ДЗЕМІДОВІЧ.

Старшыня Гомельскага райпрафсаюзу Грыбанаў зьнят з работы

25 ліпеня бюро Гомельскага гаркому КП(б)Б абмеркавала пытаньне аб ходзе рэалізацыі пастановы СНК і ЦК КП(б)Б па Гомельскім чыгуначным вузле. У прыняцьці пастановы ў частцы ацэнкі становішча райпрафсаюзу (гл. «Зьвязду» № 163), адзначаны недапушчальна фармальныя мэтады кіраўніцтва РПС.

Гарком зацьвердзіў пастанову фракцыі РПС аб зьнятьці **Грыбанава** з работы. Справа аб яго партыйнасьці перадана на вырашэньне ў РКК.

«Ня гледзячы на неаднаразовую пастаноўку пытаньня РПС і парторгам раёну,—гаворыцца ў пастанове бюро гаркому,—перад дарпрафсожам Зах. чыгунак аб становішчы ў РПС і пагодзінасьці старшыні РПС **Грыбанава**, кіраўніцтва дарпрафсаюзу дапусьціла саноўна-барскія, бюрократычна-фармальныя, чыноўніцкія адносіны да патрабаваньняў мас і замест хутчэйшага выраўнаньня чытаньня зваялося гнілa-ліберальная цыпляматыя, замазваньнем існуючых недахопаў...»

Адзначана, што фракцыя РПС, парт арганізатар раёну і фракцыя ГСПС не даволі настойліва дабіваліся перад вышэйшымі парторганамі хутчэйшага выраўнаньня гэтага пытаньня.

Указана кіруючым работнікам райпрафсаюзу— **Голаньу і Ануфрыеву** на недапушчальнае з іх боку ослабленьне ўвагі нізавым прафорганам. **Я. І.**

Сабатаж яшчэ не зламаны

Віцебскі эксплёатацыйны раён зьяўляецца адным з буйнейшых у БССР. Даволі сказаць, што аб'ём яго работы складае каля паловы ўсяго аб'ёму МБВ дарогі. Да гэтага трэба дадаць, што іменна Віцебскі раён злучае буйнейшую пралетарскую сталіцу поўначы з поўднем. Між тым, вузел раёну ўвесь час работае дрэнна, сыстэматычна зрывае планы перавозак.

Адсюль зразумела выключная актуальнасьць для раёну справы хутчэйшай перабудовы работы на аснове пастаноў СНК і ЦК. Перабудова — просты шлях для ліквідацыі адставаньня.

Факты гаворыць, што гэту перабудову раён недапушчальна затагнуў, што ў радзе зьвеньняў да гэтага часу не зламаны сабатаж. Аб гэтым ужо некалькі раз «Зьвязда» сыгналізавала. Зараз мы прыводзім новыя факты, якія сьведчаць аб тым-жа.

Як вядома, адной з рашаючых умоў перабудовы зьяўляецца пераканцка інжынэрна-тэхнічных работнікаў з кацыярыя на вытворчасьць — у дэпо, на лінію. Як Віцебскі раён выканаў у гэтай частцы пастанову СНК і ЦК?

Паводле ўстаноўленых штатаў у апараце райкіраўніцтва замест 166 чал. павінна застацца 86. Аднак, ужо зараз райкіраўніцтва ўлітрылася за лік розных махінацый **перавысіць** гэту лічбу да 91. Ці ня ясна, што гэта ёсьць простае ігнараваньне ўказаньняў партыі і ўраду? Чыноўніцкія элемэнты з кіраўніцтва ўсё яшчэ ня могуць разьвітацца з разбухшымі штатамі, імкнуцца рознымі мерамі абыйсьці дырэктывы СНК і ЦК.

Надзвычай паказальна, як кіраўніцтва раёну расставіла інжынэрна-тэхнічныя сілы па пэрыферыі. З 81 чал. адкамандыраваных з райкіраўніцтва 53 чалавека... засталося ў **Віцебску** (66 проц.), 13 чал. паслана ў **Нова-Сакольнікі** і 10 у **Полацак**. Лінія-ж, нізавыя вытворчыя і гаспадарчыя адзінкі, атрымалі ўсяго **толькі 4 чал.**

Дырэкцыя прыслала ў раён 17 інжынэраў і тэхнікаў, аднак 1 з гэтага ліку 6 чал. **асела ў Віцебску.** Дзе-ж тут правільная расстаноўка людзей? Тут ёсьць простае скажэньне ўказаньняў партыі і ўраду аб умацаваньні лініі.

Абураючым па сваім характары зьяўляецца сабатаж справы забесьпячэньня перакінутых ІТР з боку яшчэ не перабудаванай транспартнай казэрацыі. Прыбыўшым з дырэкцыі інжынэрам і тэхнікам старшыня Віцебскага ТСТ Ком адмовіўся выдаць вячэры і сьнеданьні ў сталовай. Загадчык Невельскага куста ТСТ найпоў яшчэ далей. Ён зусім ня выдаў прыбыўшым інжынэрна-тэхнічным работнікам хлебных картак і забаркіў карыстацца сталовай.

Ці ня ясна, што мы маем тут справу са **сьвядомым шкодніцкім супрацьдзеяньнем** рэалізацыі ўказаньняў СНК і ЦК аб стварэньні спрыяючых матар'яльна-бытавых умоў перакінутых па вытворчасьць інжынэрна-тэхнічным работнікам? Партыйныя-ж арганізацыі на гэта не рэагавалі.

Надзвычай затагнулася атэстацыйная работа. Многа работнікаў яшчэ не прайшло атэстацыі. Чакаючы не шмат хто яшчэ сядзіць без справы, ня выяжджае на месца прызначэньня. Так, на 23 ліпеня па фінансаваму аддзелу раёну (Нач. **Левін**) з вылучаных да пасылкі на гаспадарчыя пасады 11 чал. прайшло атэстацыю 6, а выехала пакуль што толькі тры чалавекі. Між іншым у гэтым аддзеле ёсьць поўная недацэнка справы ўмацаваньня нізавых вытворчых зьвеньняў гаспадарчымі кадрамі.

Ня скончана яшчэ работа па атэстацыі ў вагонным дэпо, па дыстанцыі шляху і інш. Характэрна, што ў часе атэстацыйнай работы ўжо ўдалося выявіць многа чужога элемэнту — кулакоў, былых жандараў, кантрабандыстаў і г. д. (**Мартынаў, Кайтанаў, Кадзетаў, Захараў, Зйсман, Волкаў, Сьвістуноў** і інш.) гэта паказвае, якую вялікую карысьць можа даць атэстацыйная работа, калі да яе падыходзіць не фармальна.

Прапрацоўка дысцыплінарнага статуту — гэтага важнейшага дакумэнту і вагара ўздыму працоўнай дысцыпліны, толькі зараз пачалася па раёну, прычым у радзе месц гэту работу праводзяць фармальна, не ўзьвяўшы яе на належную палітычную вышыню.

Заг. паравозных брыгад **Палуянаў**, напрыклад, выключна бюракратычна падышоў да гэтай справы. Ён паклаў дысцыплінарны статут на стале ў дзяжурным пакоі, прымацаваў да яго ліст чыстай паперы і даваў машыністам расьпісвацца ў тым, што яны чыталі яго. Наўрад ці можна прыдумаць больш чыноўніцкі мэтад «прапрацоўкі». Ня можа ўдасьць, што такі «мэтад» не дае ніякага эфэкту ў справе ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны, што большасьць машыністаў ўсё роўна ня ведае статуту.

У пастановах СНК і ЦК аддаецца вялікая ўвага змазчыкам. Гэта зусім зразумела. Стан вагоннай гаспадаркі ў многім залежыць іменна ад іх. Адной з асноўных прычын нагоршаньня работы вагоннага парку зьяўляецца шкодніцкая работа клясава-варожых элемэнтаў, якія пралезьлі на пасады змазчыкаў. Ачыстка радоў змазчыкаў ад гэтых прымазаўшыхся элемэнтаў, павышэньне ўвагі да работы змазчыкаў, палепшаньне абслугоўваньня, перабудова сыстэмы зарплаты, — вось што патрабавалі партыя і ўрад.

Ажыцьцяўленьне гэтых патрабаваньняў у Віцебскім раёне праходзіць выключна марудна. Тут проста недацэнкі гэтай работы. Да гэтага часу да змазчыкаў не даведзены пастановы СНК і ЦК, не даведзены новыя стаўкі.

Зусім ясна значэньне аўладаньня тэхнікай для работнікаў сацыялістычнага транспарту, асабліва на сучасным этапе. Адным з асноўных элемэнтаў перабудовы чыгуначнага транспарту і зьяўляецца іменна аўладаньне новай тэхнікай. Між тым, можна проста сказаць, што ў Віцебску гэту справу ігнаруюць.

Як вядома, паводле новага палажэньня бюро па тэхнічнай прапагандзе ліквідуюцца. Гэта ні ў якім разе не азначае, што справа па тэхпрапагандзе ў якой-небудзь меры павінна быць паслаблена. Наадварот, для гэтага кіраўніцтва ўсёй справай тэхпрапаганды перадана начальнікам адміністрацыйных і гаспадарчых адзінак.

У Віцебску-ж зразумелі ліквідацыю бюро тэхпрапаганды сваяасабліва. Ліквідавалі бюро і разам з тым разбурылі ўсю работу. Існаваўшыя гурткі тэхнічнай прапаганды па дыстанцыі, па вакзалах зараз не працуюць. Начальнік дыстанцыі **Рэпінскі** і іншыя справай арганізацыі тэхнічнай прапаганды не займаюцца.

— Вось кончым перабудову, тады возьмемся за тэхпрапаганду, — разважаюць яны, не разумеючы, што наладжаньне гэтай работы — сустаўная частка перабудовы.

Прыведзеныя факты паказваюць, што ў Віцебскім раёне няма сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за рэалізацыю гістарычных пастаноў СНК і ЦК, што сабатаж перабудовы работы ў радзе зьвеньняў яшчэ не зламаны.

Перагрэтаецкі павінна неадкладна прыцягнуць да парт. і судовай адказнасьці сабатажнікаў, бюракратаў, якія супраціўляюцца рэалізацыі рашэньняў партыі.

ЯКАБСОН.

Упор на якасьць рамонту паравозаў

Важнейшым розультатам рэалізацыі пастаноў СНК і ЦК павінна быць палепшаньне работы паравознага і вагоннага парку. Надыходзячыя асеньнія і зімовыя перавозкі, масавы паток сельска-гаспадарчых грузаў новага ўраджаю патрабуюць рашэньняў за ўсё поўнага і добраякаснага выкананьня пляну аздараўлеьнага рамонту паравозаў і вагонаў.

Матар'ялы, якія ёсьць у транспартнай групе ЦКК-НК РСІ паказваюць, што ў гэтай справе далёка ня ўсё добра.

Па дэпо **Асіпавічы і Магілеў** плян аздараўлеьнага рамонту пад простай пагрозай зрыву. Асабліва дрэннае становішча з якасьцю рамонту. Паўторнасьць вялікая на ўсіх дэпо.

Прывядзем некалькі прыкладаў: Паравоз № 6739 быў выпушчан дэпо Магілеў з пад'ёмачна - аздараўлеьнага рамонту з таўшчынёй бандажа ў 35 мм. у той час, як паводле правіл бясьпечнасьці руху дазваляецца для гэтай серыі паравозаў ня ніжэй як 38 мм. Такім чынам паравоз павінен быць адразу-ж зьвернут назад на рамонт, або скарыстаны на маневровай рабоце.

Чатыры паравозы, прайшоўшыя аздараўлеьны рамонт у дэпо **Асіпавічы** Магілеў і Жлобін, мелі ад 3 да 7 паўторнасьцей.

Паравоз № 7278 выпушчаны з рамонту заводам імя **Ланцуцкага**, але, як ака залася, кацёл так адрамантавалі, што прышлося два разы пасылаць на паўторны рамонт у Гомель і Жлобін.

Па гэтых фактах дырэкцыя заходніх чыгунак ніякіх мер ня прымае, ня гледзячы на рад сыгналаў, якія да яе паступалі.

Яшчэ больш абцінае становішча на паравоза-рамонтным заводзе ў Полтаве. З 11 паравозаў дэпо Магілеў, якія прайшлі рамонт у гэтым заводзе, 8 ужо мелі буйную паўторнасьць, прычым характэрна, што асноўны рамонт прыходзіцца на перарабку залатнікоў і поршняў. Як відаць, на гэтым заводзе дзейнічае чыжыці шкодніцкая рука. У першую чаргу трэба прыцягнуць да складу кантролёраў прыёмчыкаў дырэкцыі дарогі, якія прапускаюць такую работу. На гледзячы на рад зваротаў па гэтаму поваду ў дырэкцыю дарогі, яна не адгукнулася і не рэагавала.

Значным тормазам у своячасовым выкананьні плянаў спецрамонту зьяўляецца перапрастой паравозаў у рамонце. Па дэпо Віцебск з 34 паравозаў толькі адзін прастаяў час, вызначаны нормай, а рашта 33 паравозы мелі 114 проц. перапрастою. Па дэпо Ворша 12 паравозаў мелі 70 проц. перапрастою, па дэпо Асіпавічы 9 паравозаў мелі 84 проц. перапрастою. Дрэннае плянаваньне, няправільная расстаноўка рабочай сілы, адсутнасьць сапраўднага кіраўніцтва—вось выпікі перапрастояў.

Прыведзеныя факты паказваюць, што справа з падрыхтоўкай паравознага парку да асеньня-зімовых перавозак пастаўлена надзвычай дрэнна. Ад пачатку гэтых перавозак нас аддзяляюць дні, між тым паравозны парк яшчэ далёка не гатоў, прычым асабліва дрэннае становішча якасьці рамонту.

Задача партыйных арганізацый чыгуначнага транспарту — сканцэнтраваць максымум увагі на неадкладнае фарсаваньне тэмпаў і палепшэньне якасьці рамонту. Канкрэтнай рэалізацыяй пастаноў СНК і ЦК павінна быць — даць здаровы паравоз асеньня-зімовым патокам сацыялістычных грузаў!

Я-с.

Слова за Менгаркомам КП(б)Б

У «Зьвязьдзе» ўжо прыводзіліся факты недапушчальных адносін гаспадарчых і партыйных арганізацый Менскага чыгуначнага вузла да стварэньня спрыяючых матар'яльна-бытавых умоў нова-прыбыўшым на работу інжынэрна-тэхнічным работнікам. Аднак, да гэтага часу ніякага пералому няма.

З прысланых 25 чалавек атрымалі кватэры толькі тры. Ніхто гэтым пытаньнем як належыць не займаецца. Работнікі жывуць у памяшканьні кандуктарскіх брыгад і вагонах. Інжынэр дыстанцыі службы шляхоў т. ЧАРНОЎ нават прымушан езьдзіць начаваць кожны дзень дамоў на ст. Барысаў. Зусім відавочна, што ад гэтага церпіць толькі праца. Прычым з боку гаспадарчых арганізацый да т. ЧОРНАГА праяўлена выключная абыякавасьць, якая пераходзіць усякія межы. Яму прапанавалі аспабаніць жыцтэру, якую ён займае на ст. Барысаў. Выходзіць паводле гэтых бюракратаў, што інжынэру, якому яны абавязаны стварыць самыя спрыяючыя ўмовы для працы, трэба дзесьці шукаць прыватную кватэру. Зусім відавочна, што вінаватыя ў гэтым эпізоду і простым сабатажы пастаноў СНК і ЦК аб увазе да перакінутых ІТР павінны панесьці самую суровую адказнасьць.

На вузле ёсьць 14 добрых кватэр, якія займаюць асобы, ніякага дачыненьня ня маючыя да транспарту, але іх чамусьці ніхто не чапае. Менскі гарсавет павінен дапамагчы вузлу ў аспабаненьні занятых кватэр.

Па-ранейшаму дрэнна з забесьпячэньнем новапрыбыўшых ІТР. Старшыня ТСТ АШАРОВІЧ не жадае забясьпечваць прыбыўшых работнікаў сьнеданьнямі і вячэрамі.

Пытаньнямі ўзбуйненьня норм на 8-м вучастку службы шляху яшчэ не пачалі займацца. Дырэкцыя МБВ чыг. прыслала тэлеграму, што нормы для службы шляхоў будуць перагледжаны асобнай брыгадай пры НКПС, тут толькі можна ўзбуйніць тыя нормы, якія выпрацаваны на месцы (іх усяго ½ проц.).

Пасьля тэлеграмы прайшоў ужо значны час. Ад дырэкцыі новыя стаўкі не атрыманы, а тут аб гэтым ніхто не клапоціцца.

Трэба сказаць, што служба шляхоў наогул дрэнна выконвае свае пляны. За тры месяцы зьмена шпал, якая павінна быць закончана да 1-га верасьня, праведзена толькі на 52 проц. Яшчэ горш стаіць справа з укладкай шчабню і падвозкай баласту. Ніякага зруху няма і зараз.

Задача заключаецца ў тым, каб неадкладна зьнішчыць недахопы ў рабоце, перабудаваць мэтады кіраўніцтва, пакараць вінаватых у ігнараваньні матар'яльна-бытавых умоў інжынэрна-тэхнічных работнікаў.

ПАДАРОЎСКІ.

Сыгналы не пачуты

«Зьвязда» неаднаразова сыгналізавала аб злачынна-марудных тэмпах перабудовы работы Жлобінскага эксплёатацыйнага раёну, аб простых фактах сабатажу. На сёньня справа мала чым пасунулася наперад. Лепшым пацьвярджэньнем служыць тое, што паказальнікі выкананьня транфінпляну ніколі не палепшыліся.

Плян пагрузачна-разгрузачных работ за першую дэкаду ліпеня выкапан усяго толькі на 77,3 проц., за другую дэкаду яшчэ менш — на 69 проц.

24-га ліпеня павінна было быць пагружана 356 таварных вагонаў, падалі 304, а загружана 250. Такім чынам за адзін дзень недагружана 106 вагонаў. 25 ліпеня замест 308 вагонаў пагрузілі 241.

Ня лепш і з выкананьнем астатніх вымяральнікаў. Нормы пробегу таварных паравозаў і вагонаў ня выконваюцца. Адыход цягнікоў па раскладу ў першай дэкадзе ліпеня складаў 86,7 проц. заданьня, а ў другой дэкадзе справа яшчэ лепшчылася—выкананьне складае 80,48 проц.

Падапыя лічбы ёсьць вынік таго, што перабудова работы праводзіцца толькі фармальна, а не па сутнасьці, што мэтады гаспадарчага кіраўніцтва фактычна ня зьменены, што чыгуначныя арганізацыі ня здолелі ўзначаліць творчы энтузіязм рабочых-чыгуначнікаў, якія ў адказ на пастанову ўзялі на сябе рад канкрэтных самаабавязацельстваў, ня здолелі павысіць працоўную дысцыпліну. Іменна апошнім можна тлумачыць тое, што лік сцараньняў ня толькі не паменшыўся, але ў некаторых месцох нават павялічыўся.

21 ліпеня на станцыі **Асіпавічы** быў разьбіт вагон па віне сыгналіста **Піскуна** і саставіцеля **Чарэйка**. Важкі гэтага факту маса ня была мабілізавана. Піскун хоць і звольнен з працы, але самы факт здарэньня не абмяркоўваўся на сходах рабочых, не ўзьняты па прынцыповую вышыню.

З вялікім спазьненьнем прайшла і перасоўка інжынэрна-тэхнічных работнікаў в канцылярый у вытворчыя зьвеньні транспарту. Інжынэр **Бутаў** прызначаны начальнікам аператыўнага ў Менскі, прыступіў да працы толькі 25 ліпеня. Член партыі, інжынэр **Еўдакімаў**, які доўгі час супраціўляўся перакідцы, усё яшчэ «прымае» справы і за сабатаж не панёс ніякага спагнаньня. Інжынэр **Гук**, які першым заявіў аб добраахвотным жаданьні працаваць на вытворчасьці, толькі гэтымі днямі быў адкамандыраван з раёну. Тэхнік **Зінеевіч** і да гэтага часу ўсё здае справы, а тэхнік **Бэйлін** чамусьці затрыман дырэкцыяй дарогі ў Калузе.

Г. Ф.

Сабатажнік і злачынца Касалапаў пад апекай райкіраўніцтва

Паводле пастаноў СНК і ЦК у апаратах чыгуначнага транспарту ліквідавана пасада тэхпрапаў. Работа па арганізацыі тэхнічнай падрыхтоўкі кадраў усклядзена непасрэдна на начальнікаў.

Прараб вучастку дыстанцыі шляху **Касалапаў** (Віцебск) дайшоў у сваёй нахабнасьці да таго, што афіцыйна ўзьняў пытаньне перад нач. дыстанцыі аб застаўленьні яму штатнай адзінкі — работніка па тэхнічнай прапагандзе.

Гэты бюракрат, прывыкшы да саноўна-барскіх мэтадаў работы, «абгрунтаваў» свае здадзяцтва тым, што перагружан работай «па агульным кіраўніцтве» і таму займацца канкрэтнай справай арганізацыі тэхпрапаганды яму няма часу.

Як бачыце, Касалапаву аказалася не па густу пастанова СНК і ЦК, ён хоча не абыйсьці як-небудзь, узаконіць тое, што скасавана гэтай пастановай.

Хто-ж такі Касалапаў?

Ён ужо 5 год, як працуе па будаўніцтве, ці правільней кажучы, не працуе, а шкодзіць. У яго яшчэ з 1931 году ня скончаны рад аб'ектаў будаўніцтва, ёсьць шмат перароблак, перавы дэтак і проста злачынстваў. Надаўна ён склаў фіктыўны рахунак прыкладна на 50 тыс. руб. на выкананую работу.

І вось гэтага злачынцу раённае кіраўніцтва перапяставала і зацьвердзіла прарабам вучастку. Іванкі, як сьвядомым патуранцем з боку райкіраўніцтва назваць гэта нельга.

Е.

ПАКОНЧЫЦЬ З САНОЎНА-ПАНСКІМІ МЭТАДАМІ КІРАЎНІЦТВА

(Некаторыя пытаньні перабудовы работы на чыгуначным транспарце)

На чыгунках больш чым у іншых галінах народнай гаспадаркі ўкараніліся старыя чыноўніцкія мэтады кіраўніцтва. Тут больш чым усюды ня ўлічылі ўказаньняў тав. Сталіна, якія ім былі зроблены яшчэ ў 1931 г. на нарадзе гаспадарнікаў: «Што патрабуецца, — пытаў ён — для таго, каб наладзіць кіраўніцтва па-новаму? Для гэтага патрабуецца перш за ўсё, каб кіраўнікі гаспадарчыя кіраўнікі зразумелі новую абстаноўку, вывучылі канкрэтна новыя ўмовы разьвіцьця прамысловасьці і перабудавалі сваю работу адпаведна з новымі патрабаваньнямі».

Кіраваць не «нагуп», не «з паветра», а канкретна, прадметна, ува ходзячы ў курс справы, у дэталі, у кробкі,—так ставіў задачу тав. Сталін. Гэта датычыла ня толькі гаспадарнікаў прадпрыемстваў, але і кіраўнікоў чыгунак.

Трэба проста сказаць, што ўказаньні правадыра нашай партыі, асабліва на чыгунцы, ня былі ў поўнай меры скарыстаны для канкрэтных дзеяньняў.

Зараз, па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) і асабіста тав. Сталіна вызначана канкрэтная праграма перабудовы.

Партыя і ўрад далі разгорнутую праграму перабудовы і аб яе рэалізацыі будуць сушыць не на колькасьці вынесеных пастаноў, не на славесная дэкларацыйнасьці, а па канкрэтных справах, па выкананьні транфінпляну, па выніках правядзеньня асеньня-зімовых перавозак.

Як-жа выглядае перабудова кіраўніцтва на аснове пастаноў СНК і ЦК па эксплёатацыйных раёнах БССР?

Пастуючыя сыгналы з месц, праверка, праведзеная транспартнай групай ЦКК-НК РСІ БССР, сьведчаць, што перабудова пакуль што праведзена толькі фармальна. Запэўненьні намесьніка начальніка Аршанскага раёну **Заитевіча** і намесьніка парторга Гомельскага раёну **Астапенка** аб тым, што перабудова ўжо закончана, ёсьць просты розультат бюракратычнага, чыноўніцкага падыходу да рэалізацыі гістарычных пастаноў партыі і ўраду.

Па паміжных раёнах (дый па **Віцебскім і Жлобінскім** ня лепш)— значныя прарывы ў рабоце. Паравозны і вагонны паркі і шляхі далёка яшчэ не гатовы да асеньня-зімовых перавозак, якія вось-вось павінны пачацца. У Гомелі ў апошнія дні процант хворых паравозаў даходзіць да 16 пры заданьні ў 11. Толькі за 13 дзён ліпеня тут было 8 выпадкаў выплаты падшыпнікаў. Кожны дзень адчэпліваюцца вагоны ў дарозе. Значныя перавышэньні нормы хворых паравозаў і вялікія адчэпкі вагонаў таксама ў Аршанскім раёне.

Асабліва дрэнная якасьць рамонту. У **Воршы** 20 ліпеня адчэпілі 144, а 21 ліпеня—83 вагоны з тэхнічнымі недахопамі, якія прыбылі толькі з аднаго **Магілева**. Падобных фактаў можна прывесьці шмат.

Матар'ялы, якія сёньня прыводзіцца з гэтых раёнаў, сьведчаць, што тут няправільна расстаўлены сілы, многа асела ў апаратах, на буйных вузлох, а нізы зусім абыдзены. Атэстацыйная работа толькі пачалася. Працысцыплінна нізкая і інш.

Прыведзеныя факты бліскуча пацьвярджаюць тое, што сказана ў пастанове СНК і ЦК аб палітаддзелах, дзе гаворыцца: «**самая большая небясьпека... заключаецца нават ня ў тым, што зьявіліся адзінкі аслабленьня работы** і перабоў у чыгуначным транспарце. Найбольш сур'ёзная небясьпека заключаецца ў тым, што работнікі чыгуначнага транспарту ў сваёй бальшасьці не заўважаюць, ня бачаць гэтых трывожных адзнак, а хто бачыць—стараецца іх замазаць, ня ўсьвядаць і ліквідаваць іх, а замазаць, замаўчаць».

Дзе сапраўдныя прычыны адставаньня ў рабоце чыгуначных раёнаў?

Прычына хаваецца ў тым, што, правёўшы перабудову на паперы, не правялі яе на справе, не перабудавалі мэтадаў сваёй работы.

Паказальнай у даных адносінах зьяўляецца практыка работы партарганізатара Аршанскага чыгуначнага раёну **Батвы**. Батва, пабыўшы пяць сутак на Менскім вузьле, на мог ня бачыць раду злачынных зьявішч, простых праяўленьняў сабатажу перабудовы. Здавалася-б, трэба адразу рашуча рэагаваць на ўсе выяўленыя агідзнасьці. Аднак, ён, як той наглядальнік, праканстатаваў факты, напісаўшы аб іх, да рэчы, ву сім бясспэцыяльную дакладную запіску ў Менскі гаркам КП(б)Б і паехаў назад у Воршу. Наўрад ці трэба даводзіць, што гэта зьяўляецца ўзорам саноўна-панскага кіраўніцтва.

А вось другі прыклад падобных мэтадаў работ. Начальнік Віцебскага эксплёатацыйнага раёну **Васільеў** па старой прывычцы пасаны «узаконіць» пастанову СНК і ЦК выключна на бюракратычным загадам. Загад меў 7 пунктаў і ўсе яны гаварылі аб адным: трэба пачаць перабудову. А як перабудоўваецца, што канкрэтна каму рабіць—аб гэтым ні слова.

Паэтул трэба проста сказаць, што да кіраўніцтва па-новаму ў большасьці раёнаў чыгункі яшчэ не прыступілі. Рабочыя інструктары пакуль што сядзяць у апараце ў той час, калі іх месца зараз у нізох—на вытворчасьці, на лініі, асабістым жывым удзелам, праверкай выкананьня змагацца за перабудову транспарту, за балвую падрыхтоўку да асеньня-зімовых работ.

Важнейшым вагаром ўздыму работы транспарту зьяўляецца перабудова сыстэмы заработнай платы. Пастанова СНК і ЦК дала наконт гэтага зусім вычарпальныя ўказаньні. Дабіць дробна-буржуазную ўраўнілаўку, павысіць стаўкі інжынэрна-тэхнічных работнікаў, якія працуюць на вытворчасьці на 15 проц. супроць адпаведных кваліфікацый, што працуюць у апараце дырэкцыі і інш., палепшыць аплату вядучых прафэсій — вось асноўная задача.

«**Ня можна цярпець, каб машыніст на чыгуначным транспарце атрымліваў столькі-ж, колькі перапісчык.** Маркс і Ленін гавораць, што розьніца паміж працай кваліфікаваных і працай некваліфікаваных будзе існаваць нават пры сацыялізме, нават пасьля зьнішчэньня клясаў, што толькі пры камунізме павінна зьнікнуць гэта розьніца, што з прычыны гэтага, «зарплата» нават пры сацыялізме павінна выдавацца па працы, а не па патрэбнасьці... Хто будзе зараз тарыфную сыстэму на «прынцыпах» ураўнілаўкі, бяз улику розьніцы паміж працай кваліфікаваных і працай некваліфікаваных, той рве з марксізмам, рве з ленінізмам» (СТАЛІН).

Перабудова сыстэмы зарплаты, як паведамляюць з Віцебску, Воршы, Гомелю, Жлобіна толькі пачынаецца, гэта пры тых умовах, калі па эксплёатацыі з 1-га жніўня павінна ўжо выплачвацца зарплата па новых стаўках. Прафсаюзныя арганізацыі ў большасьці сваёй прымаюць слабы ўдзел у гэтай рабоце. Між тым, зарплата—адзін з тых вучасткаў «за які пралетарыят і яго партыя ў праве спагнаць з саюзаў больш, чым за які-небудзь іншы вучастак прафработы» (КАГАНОВІЧ).

На-ходу зьнішчаючы недахопы перабудовы, карэнным чынам мяняючы мэтады кіраўніцтва, выкрываючы і выпаляючы сабатажнікаў, якія грацюць на руку клясаваму ворагу, ачышчаючы транспарт ад кулацкіх і антысавецкіх элемэнтаў, узьнімаючы сьвядомую дысцыпліну і сацыялістычнае спаборніцтва, забясьпечым круты ўздым у рабоце транспарту.

Партыя покладае вялікую адказнасьць за перабудову на камуністаў. Пры гэтым трэба памятаць, што для таго, «каб узьняць чыгуначны транспарт на патрэбную вышыню і вывесьці яго на шырокую дарогу, работнікі транспарту павінны перш за ўсё ўзьняць сваю кваліфікацыю, павінны вывучыць тэхніку справы, павінны аўладаць тэхнікай, павінны стаць знаўцамі і сапраўднымі гаспадарамі справы» (з пастановы ЦК УсеКП(б) аб палітаддзелах).

Паст

ВЫШЭЙ РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ

(Да чысткі партарганізацыі Менскага гарнізону міліцыі)

Асноўныя задачы чысткі партыі былі выразна сфармуляваны ў пастановах ЦК і ЦКК УсеКП(б): «Задача чысткі партыі заключаецца ў павышэньні ідэалёгічнага ўзроўню членаў партыі, у палітычным і арганізацыйным умацаваньні партыі, на лейшым узмацненьні давер'я да партыі мільёнаў беспартыйных мас». За пасмяховае выкананьне гэтых задач павінен змагацца па-бальшавіцку кожны камуніст, кожны сумленны працаўнік.

Партарганізацыя Менскага гарнізону міліцыі ў барацьбе за ажыцьцяўленьне ўказаньняў партыі па пытаньнях чысткі разгарнула вялікую падрыхтоўчую работу. Былі праведзены сходы, арганізаваны гурткі па вывучэньні праграмы і статуту партыі, гурткі бягучай палітыкі, былі праведзены палітбаі, вечары пытаньняў і адказаў, арганізаваны кансультацыйныя бюро па ўсіх пытаньнях партыйнага будаўніцтва, праведзен рад інструкцыйных нарад і г. д.

Адна, асноўнымі недахопамі ўсёй падрыхтоўчай работы зьяўляецца тое, што візавыя ячэйкі, партарганізатары ня здолелі ўвязаць задачы чысткі з канкрэтнымі пытаньнямі работы міліцыі, яны ня здолелі ў належнай ступені мабілізаваць кожнага камуніста, кожнага міліцыянэра вакол канкрэтных пытаньняў, якія стаяць перад кожным работнікам міліцыі.

Візавы друк у большасьці абмяжоўваўся толькі тым, што зьмяшчаў агульныя заметкі аб чысткі, але не ў выстарчальнай ступені ўскрываў недахопы, прарывы кожнай часьці, падразьдзяленьня, кожнага камуніста ў паасобку, ад ным словам візавы друк у сувязі з гэтым ня здолеў мабілізаваць усю грамадзкасьць па ліквідацыю прарываў, якія мелі месца ў рабоце, на барацьбу з посьбітамі гэтых недахопаў і прарываў.

Да недахопаў таксама трэба аднесьці і тое, што камсамольская арганізацыя, якая налічвае каля 100 чалавек камсамольцаў, зусім не праводзіла падрыхтоўкі да чысткі партыі. Такое важнейшае мерапрыемства, та кім чынам, прайшло міма камсамолу. Праўда, бюро партколектыву ўказань няў камсамолу давала нямала, але гэтыя ўказаньні не знайшлі канкрэтнага практычнага адлюстраваньня ва ўсёй рабоце камсамольскай арганізацыі міліцыі.

Гэтыя недахопы падрыхтоўчай работы да чысткі партыі з боку раду ячэек бязумоўна адчуліся, калі праверком прыступіў да пэрсанальнай чысткі камуністаў.

Рабоча-сялянская міліцыя не адгароджана кітайскай сьцяной ад усіх працэсаў, што адбываюцца ў нашай краіне. Абвастрэньне клясавай барацьбы, выкліканае рашучым наступленьнем сацыялізму на ўсім фронце, новая тактыка клясавага ворага кладзе свой адбітак і на міліцыю. У міліцыю імкнуцца пралезьці, а часамі і пралазяць клясава-варожыя элементы, якія вядуць контр-рэвалюцыйную разбуральную работу.

Што выявіў праверком, калі перайшоў да пэрсанальнай чысткі? Падамо некалькі прыкладаў, якія выкрыты ў часе чысткі партарганізацыі Менскага гарнізону.

Работнік міліцыі, член КП(б)Б **Ціцюха** ў часе праверкі быў выяўлен, як яўны кулак, ён нават пры ўсіх камуністах ячэйкі і беспартыйных сьцьвярджаў, што «савецкая ўлада займаецца рабочым сілян», і даволі адкрыта заклікаў міліцыянэраў да барацьбы супроць савецкай улады. А вось паглядзім, якую добрую характарыстыку дае аб ім ячэйка КП(б)Б, у якой ён знаходзіцца: «Ціцюха пісьменны, нагрузку выконвае, з работай спраўляецца, дысцыплінаваны, аўтарытэтам карыстаецца, палітычна падрыхтован здавальняюча». Гэты факт яркa паказвае, да чаго прытулілася клясавая пільнасьць у гэтай ячэйцы, да чаго ва многіх выпадках даходзіць заведаньне людзей.

Цікава прывесьці адказ аднаго з кіраўнікоў гэтай ячэйкі тав. **Падліпскага** на пытаньне, якое яму было пастаўлена праверкомам: «Як вы ведзяце барацьбу з клясава-варожым элементам». Падліпскі, доўга ня думаючы, адказаў: «У мяне ўсе на 100 проц. і ўсё пад 100 проц.». Ці ня ясна, што толькі праз такіх «очковтирателей» мог заставацца ў партыі да чысткі яўны кулак, контр-рэвалюцыянэр.

Аналёгічныя факты былі выкрыты чысткай і ў радзе іншых ячэек менскага гарнізону. Напрыклад, член партыі **Сьлацкі** пры чысткі выкрыт, як яўны кулак. Гэты Сьлацкі, які лічыўся мнімым батракам, шляхам ашуканства пралез у партыю і ў міліцыю і «ціхай сапай» вёў разбуральную работу ў падразьдзяленьнях, дзе ён знаходзіўся. Ён распаўсюджваў сярод міліцыянэраў кавалерыйскай часьці кулацкія настроі, ён падбухторваў адсталых міліцыянэраў выказваць нездавальненьне камандваньнем, нездавальненьне работай і г. д. А ячэйка своечасова не «раскусіла» яго кулацкай работы, якая ўсёй сваёй вострасьцю была накіравана на дэзарганізацыю радоў дзьвіжёну, і толькі дзяку ючы ўмяшаньню палітаддзелу галоўнага кіраўніцтва міліцыі гэтым кулацкім настроям і гэтаму кулаку быў налесен сакрушальны ўдар. А ячэйка дала яму характарыстыку да чысткі партыі ня горшую, па гэтай характарыстыцы ён мог заставацца ў партыі.

Праверкомам быў выкрыт ня страціў шы сувязі са сваёй кулацкай гаспадаркай, у мінулым дэзэртыр з Чырвонай армії, член партыі **Новікаў**. Праўда, у адносінах да Новікава бюро падрыхтавала ўсе матар'ялы да чысткі, якія паказвалі яго, як яўнага кулака.

Вось ужо 40 проц. партарганізацыі Менскага гарнізону прайшло чыстку. Падводзячы некаторыя вынікі гэтай важнейшай работы, мы павінны з усёй сілай падкрэсьліць, што партарганізацыя міліцыі ў асноўным здаровая, ідэалёгічна вытрыманая, здольная на справе ажыцьцяўляць дырэктывы партыі і ўраду. Чыстку прайшлі рад таварышоў, якія маюць баявыя заслугі перад рэвалюцыяй як у часе грамадзянскай вайны, так і ў часе мірнага будаўніцтва. Прайшлі рад таварышоў, якія на справе паказалі сябе адданымі камуністамі, бальшавікамі, яны паказалі лепшыя ўзоры работы ў барацьбе за генэральную лінію партыі, іх шмат у партарганізацыі.

Вось некаторыя з іх. **Пэдэр** — член УсеКП(б) з 1917 г., стары чэкіст, мае рад рэвалюцыйных баявых заслуг. Старшыня праверкому аднаго з кустоў па гор. Менску **Пятрукевіч**—рабочы, член КП(б)Б з 1917 г., чырвонагвардзеец, актыўна змагаўся на франтох грамадзянскай вайны, чэкіст, мае рад баявых заслуг, старшыня праверкому Барысаўскага раёну. **Бэрман** — рабочы, член КП(б)Б з 1917 г. (да Кастрычніка), стойкі бальшавік, актыўны змагар за ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту. **Міхэльсон**—рабочы, член КП(б)Б з 1917 г. (да Кастрычніка), чэкіст, герой ордэну Працоўнага сьцягу БССР. **Жыткова**—14 год батрачка, ударніца, прыкладная работніца, член КП(б)Б з 1928 году. **Дарашэвіч**—член КП(б)Б з 1918 г., чэкіст, лепшы ўдарнік і г. д.

У кіраўніцтве Галоўміліцыі ёсьць шмат т. т. стойкіх, вытрыманых бальшавікоў, якія яшчэ не прайшлі чыстку. Сярод іх т. **Фленсэр**, член ЦКК КП(б)Б, стары чэкіст, **Дзяніцкі** і інш.

Гэтыя людзі—касьцяк партарганізацыі міліцыі—паказваюць прыклады таго, як бальшавік павінен змагацца за генэральную лінію партыі на тым вучастку, дзе партыя яго паставіла.

Зараз партарганізацыя Менскага гарнізону міліцыі разгарнула работу па ліквідацыі выкрытых недахопаў і прарываў у рабоце, мабілізавалася на барацьбу за павышэньне баяздольнасьці кожнай часьці, падразьдзяленьня. Партарганізацыя наладзіла выпуск штодзённага бюлетэню, які мабілізоўваў увесь час міліцэйскую масу на дапамогу праверкому выкрываць недахопы кожнай партыйнай ячэйкі і яе работы, недахопы кожнага камуніста ў паасобку.

Палітаддзел галоўнага кіраўніцтва і партарганізацыя міліцыі ў часе чысткі наладзілі месячнік культпаходу, які даў адпаведны зрух у гэтай галіне. Быў праведзен рад суботнікаў у прытыражнай гаспадарцы, былі наладжаны вечары пытаньняў і адказаў, ня спынялі працаваць гурткі па бягучай палітыцы. Дзякуючы гэтаму значна павысіліся аўтарытэт і палітуровень камуніста, узмацнілася работа ў кожнай часьці, што ўжо дало некаторыя вынікі.

З усёй сілай трэба падкрэсьліць той факт, што чысткa выявіла невыстарчальную перабудову партыйна-масавай работы, невыстарчальную палітычную завостранасьць ва ўсёй рабоце партыйных ячэек, невыстарчальную барацьбу за лёзунг «часьць без адзінага праступку». Зараз РСМ БССР разгарнула вялікую работу па сацыялістычным спаборніцтве з РСМ Заходняй вобласьці, што патрабуе ад нас, ад кожнага камуніста, ад кожнага работніка міліцыі, максымальнай згуртаванасьці ў рабоце, максымальнага ўзьнёсьця тэмпаў і якасьці работы, разгортваньня рашучай барацьбы з маючымі месца ў нашай рабоце элементамі дробна-буржуазнай расхлябанасьці, за высокую клясавую сьвядомую дысцыпліну.

М. ШАТКІН.
П. ГУТАРАЎ.

КЛЯЙМІМ ГАНЬБАЙ НАХАБНУЮ ХЛУСЬНЮ ГЕРМАНСКІХ ФАШЫСТАЎ

Адкрыты ліст калгасьнікаў нямецкага нацыянальнага калгасу імя Эрнста Торглера (раней „Новы хорлін), Жыткавіцкага рабну

ДА УСІХ ПРАЦОЎНЫХ ГЕРМАНІІ

Радасьцю напаўняе нас нябывалы ўраджай нашых калгасных палёў.

Бурна на нашых вачох у кароткі тэрмін расьце наш калгас, перад намі адкрываюцца неабмежаваныя магчымасьці заможнага, вольнага жыцьця.

Не ад добрага жыцьця ўйшлі 130 год таму назад нашы прадзеды—леса рубы з Германіі. Цяжкае беспрасьветнае жыцьцё вялі мы ў царскі час. Дзесяткі год арандавалі нашы бацькі і дзяды і мы самі ад князя Віттэнштэйна і міліянэра Агаркова гэту зямлю, якую потам сваім раскарчавалі. Адну трэць, а то і палову ўраджаю, мы павінны былі аддаваць за гэта панам.

За некалькі год да скончэньня 60-пігадовага тэрміну, калі зямля павінна была перайсьці ў нашу ўласнасьць, выгналі нас паны з насіджанага месца.

Потым пацішла сусьветная вайна. Мы ніколі не забудзем, як нас царская ўлада ў 24 гадзіны ператварыла ў жабракоў, як нас пагналі далёка за Волгу, як нас прасьледвала нацыянальная нянавісьць, якую распальвала кіруючая клясa, як гэта нянавісьць ня раз пагражала нам сьмерцю.

Бальшавіцкая рэвалюцыя вызваліла нас і вярнула на старое месца. Яна дала нам зямлю. Яна ператварыла нас у поўна і роўнаправных членаў саюзу народаў Савецкай краіны. Яна дала нам нямецкія школы, нямецкія кнігі, нямецкія газэты, поўную магчымасьць разьвіцьця нашай нацыянальнай сацыялістычнай па зьместу культуры.

Пад кіраўніцтвам нашай камуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам нашага любімага правадыра і лепшага вучня Леніна—тав. **СТАЛІНА** зруйнавалі мы стары лад і ўступілі на шлях новага сацыялістычнага жыцьця.

Дружна працуем мы на нашых калгасных палёх. **Акрамя калгаснай малочнай фэрмы кожны з нас мае па ўласнай карове, па 1—3 сьвінькі.**

Толькі 52 клг. збожжа аддаем мы дзяржаве з кожнага гэктара калгаснага пасеву. Да таго 1 клг. і 40 грам. **на мясцовыя патрэбы.** Гэта наша цьвёрдая норма здачы. Астатні ўраджай разьмяркоўваем мы па свайму поглядзу.

Да таго-ж мы працуем у якасьці лясных рабочых-клепшчыкаў.

Мы ня ведаем, што такое беспрацоўе. Работы хапае для **ўсіх.** Наш дабрабыт цалкам залежыць **ад** нас-жа самих.

Мы ніколі ня ўтойвалі, што ломка старога жыцьця і пераход да новага —былі зьвязаны з некаторымі цяжкасьцямі. Мы трымалі жорсткі бой з клясавым ворагам. Аднак, усе гэтыя цяжкасьці сёньня — справа беззваротнага мінулага. Мы ўжо выкарчоўваем карэнні кулацтва.

Мы выкрываем і клеймім ганьбай нахабную кампанію паклёпу і лжы крывавага ката рабочых і працоўных сялян Германіі ГІТЛЕРА і яго зграі «нацы», кампанію, якая накіравана супроць нашага Савецкага саюзу.

Мы ведаем, што Гітлер пастараецца не дапусьціць, каб гэтыя нашы словы дайшлі да рабочых і працоўных сялян Германіі. **Як агня баіцца Гітлер голаса праўды аб Савецкім саюзе.** Крывавай лапай прабуе ён гэ ты голас задушыць.

Мана і паклёп патрэбны Гітлеру для таго, каб напкаваць рабочых і працоўных Германіі супроць працоўных мас Савецкага саюзу, каб запаліць пажар новай контр-рэвалюцыйнай братазьбійчальнай **вайны,** ад якой павінны атрымаць прыбытак капіталісты Германіі.

Ня «выратаваць» нас хоча Гітлер. Гітлер паказаў ужо, як ён «выратоўвае» працоўных Германіі.

Не, Гітлер хоча рукамі працоўных Германіі зруйнаваць сацыялістычную будоўлю ў СССР, ён хоча ператварыць працоўных Савецкага саюзу ў халопаў нямецкіх і вытканых расійскіх капіталістаў і памешчыкаў. Гітлер хоча задушыць пралетарскую рэвалюцыю, якая набліжаецца ва ўсім капіталістычным сьвеце і ў першую чаргу ў Германіі.

Гэтага Гітлеру ня ўдасца! Працоўныя Германіі ўсё больш пераконваюцца, што толькі пралетарская рэвалюцыя выратуе іх ад крызісу, беспрацоўя, жабрацтва, голаду і крывавага фашысцкага тэрору.

Адказ наш Гітлеру такі:

Яшчэ шчыльней згуртуем нашы рады вакол нашага правадыра—каму ністычнай партыі і яе кіраўніка тав. СТАЛІНА.

На першаму закліку нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны ўсе да аднаго станем на яе абарону.

У самы кароткі тэрмін без страт убярэм мы наш ураджай і выканаем свае абавязацельствы перад дзяржавай шляхам здачы належачага з нас збожжа з першага-ж абмалоту і не пазьней 1-га жніўня.

Мы запрашаем да свае пяць галадаючых дзяцей рэвалюцыйных рабочых і сялян, якія знаходзяцца ў фашысцкіх турмах Германіі. Мы абавязваемся аб іх добра клапаціцца і даць ім выхаваньне, нацыянальнае па форме і пралетарскае, рэвалюцыйнае па зьместу.

У гонар аднаго з лепшых сыноў германскага пралетарыята, стойкага барацьбіта за пралетарскую рэвалюцыю, які пакутуе ў фашысцкай турме, у гонар **Эрнста Торглера** аднагалосна пастанаўляем назваць яго імем наш калгас.

Ад імя агульнага сходу падпісваемся:

А. Маркварт, В. Зайдэ, Райнольд Дэтке, А. Курц, А. Дэтке, Ева Маркварт, Г. Нікель, Паўль Фіцнэр, Д. Маркварт, Марыя Маркварт, Ольга Зайдэ, Эмма Нікель, В. Зайдэ, М. Магілеўская, Марыя Дэтке, Анна Дэтке, Міхель Савіцкі, Андрэй Савіцкі, Э. Зайдэ, Г. Маркварт, П. Дэтке і інш.

Калгас ім. Эрнста Торглера, Жыткавіцкага раёну.

* Агульны сход рабочых цагельнага камбінату № 1 (Менск) пастанавіў правесьці суботнік на карысьць пабудовы эскадрыльлі імя Кагановіча. Кожны рабочы і служачы ў гэты дзень адпрацуе па 6 гадзін. Сход пастанавіў выклікаць рабочых усіх цагельных заводаў г. Менску.

***

* Рабочыя Полацкага хлебазаводу арганізавалі суботнік, сродкі ад якога ў суме 77 рублёў перадалі ў фонд пабудовы эскадрыльлі. Рабочыя выклікалі цагельню і лесазавод.

***

* Калгаснікі калгасу імя Варашылава (Лепельскі раён) ухвалілі прапанову гомельскіх рабочых і калгаснікаў і 2-га ўсебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў аб пабудове эскадрыльлі імя Кагановіча. Калгаснікі ўжо сабралі 100 руб. і выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва калгасы Заціхляскага сельсавету.

***

* ЖЛОБІН. Калгаснікі нацыянальнага яўрэйскага калгасу «Першамайскі», Пірэвенскага сельсавету, па ініцыятыве делегатаў другога ўсебеларускага зьезду калгаснікаў унесьлі ў фонд пабудовы эскадрыльлі 117 рублёў і выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва калгасы імя Леніна, Будзённага і «Колас».

Г. Ф.

***

* ТАЛАЧЫН. Дзевяць делегатаў 2-га ўсебеларускага зьлёту калгаснікаў-ударнікаў ад Талачынскага раёну ўнесьлі ў фонд пабудовы эскадрыльлі 83 рублі і выклікалі на сацспаборніцтва ўсіх калгаснікаў і аднаасобнікаў раёну.

Усесаюзны агляд падрыхтоўкі да навучальнага году

Замест палітэхнічнага абсталяваньня... клееваркі

У сваім лісьце ў рэдакцыю газэты «Правда» тав. тав. ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕД падкрэслілі, што старое кіраўніцтва Наркамасьветы «дапусьціла рад палітычных прарываў у рабоце органаў асьветы: не забясьпечыла правядзеньня дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб рабоце масавай і вышэйшай школы, палітэхнізацыі школ і ў радзе выпадкаў дапусьціла зрыў палітэхнізацыі»...

Адпаведныя палітычныя вывады з гэтага ўказаньня т. т. Гікало і Галадзеда палінны былі-б зрабіць ня толькі Наркамасьветы, але і тыя арганізацыі і ўстановы, якія закліканы партыяй і ўрадам дапамагаць органам Наркамасьветы ў палітэхнізацыі школ. Вінаватыя ў зрыву палітэхнізацыі ня ў меншай меры ляжыць і на такіх арганізацыях, як культпрамтрэст, Наркамцяжпрам, сампрамсаюз, БАКТ і ЦП саюзу працасьветы.

БАКТ зьяўляецца тэй арганізацыяй, якая абавязана забясьпечваць нашы школы палітэхнічным абсталяваньнем і навучальнымі дапаможнікамі. У мінулым годзе БАКТ з прычыны агідных, безадказных адносін да справы палітэхнізацыі школы з боку кіруючых работнікаў плян па забясьпячэньні школ палітэхнічным абсталяваньнем выканаў толькі на 30 проц. Галавацяны з БАКТу забясьпечвалі школы такімі палітэхнічнымі прыладамі, якімі школа фактычна не мацла карыстацца. Не аднак дот, а факт, што БАКТ **змаль на 100 тысяч руб. накіраваў у раёны розных дрэвапрацоўчых інструментаў без жалезак, — фактычна школы атрымалі драўляныя ручкі стамесак, далатоў, калодкі рубанкаў і інш.** БАКТ забясьпечваў школы такімі рэчамі як вугольнікі, малкі, рэйсмусы, і радам іншых прымітыўных прылад, якія на месцы можна было дастаць значна таней, а частка школ магла зрабіць іх і сваімі сіламі.

6-та мая г. г. пры Наркамасьвеце адбылася нарада прадстаўнікоў заінтэрэсаваных ведамстваў, на якой быў распрацован і прынят плян вытворчасьці палітэхнічнага абсталяваньня на другое паўгодзьдзе 1933 году. Паводле пляну, толькі ў трэцім квартале культпрамтрэст, упаўнаркамцяжпрам і сампрамсаюз абавязаны выпусьціць рознага палітэхнічнага абсталяваньня на 834 тыс. руб. БАКТ па заключаньні з Наркамасьветы дагавары абавязаўся дастаўляць у школы палітэхнічнага абсталяваньня на 2.100.000 руб. Для рэалізацыі гэтага абавязацельства БАКТ павінен заключыць дагавары з названымі вышэй гаспадарчымі арганізацыямі і прадпрыемствамі.

Паўстае пытаньне—як БАКТ, упаўнаркамцяжпрам, культпрамтрэст і сампрамсаюз рыхтуюцца да новага навучальнага году, як яны рыхтуюцца забясьпечыць лаўцы школы палітэхнічным абсталяваньнем?

Пачнем з культпрамтрэсту. У трэцім квартале трэст на сваіх прадпрыемствах абавязаўся асвоіць 30 назваў палітэхнічных прылад і выпусьціць іх на 515 тыс. руб. **У другім квартале гэтага году культпрамтрэст выпусьціў палітэхнічнага абсталяваньня для школ усяго на... 2.500 руб. і толькі адных... клееварак.** Праўда, культпрамтрэст у «клопатах» аб школе прапанаваў у другім квартале ўзяць яшчэ калодкі дрэвапрацоўчых інструментаў (без жалезак). Так «дапаматаў» палітэхнізацыі школы культпрамтрэст у другім квартале, у трэцім-жа квартале прадпрыемствы гэтага трэсту пакуль што школам нічога на дапі.

Віцебскі завод культпрамтрэсту «Кам інтэрн» увесь час супрацьціўляўся асваеньню вытворчасьці палітэхнічнага абсталяваньня і наогул работа на ім была пастаўлена проста гадобна. У выніку завод свой прамфінплян за першае паўгодзьдзе выканаў толькі на 50 проц. **На заводзе да сёньняшняга дня замест палітэхнічнага абсталяваньня пераважна выпускаюць замкі і розныя скобы.**

Ня лепш дапамагае палітэхнізацыі школы і ўпаўнаркамцяжпрам. У другім квартале прадпрыемствы апошняга выпусьцілі палітэхнічнага абсталяваньня на... 6.000 руб. У трэцім квартале ўпаўнаркамцяжпрам абавязан выпусьціць рознага палітэхнічнага абсталяваньня на 262 тыс. руб., а даў пакуль што на... 5.500 руб. Упаўнаркамцяжпрам абавязан наладзіць на падпарадкаваных прадпрыемствах выраб 23 назваў палітэхнічнага абсталяваньня, а пакуль што «асвоіў» толькі 3:—ціскі стуладыя, сьвідравальныя і наждачныя варштаты.

Такі-ж прыблізна малюнак і ў Сампрамсаюзе. У трэцім квартале ён абавязаўся даць палітэхнічнага абсталяваньня на 56 тыс. руб., а пакуль такі сама яшчэ нічога на даў. У арцелях Сампрамсаюзу з 10 назваў «асвоеных» выраб толькі 2:—сякерак і долатаў. Да рэчы, аб гэтых самых сякерках. Дрыбінская арцель Сампрамсаюзу выраблае сякеркі з адкідаў, што не падлягае 50 процантнай бюджэтнай нацэнцы. Фактычна-ж арцель накладвае бюджэтную нацэнку і не ўказвае аб гэтым у рахунку. БАКТ-жа са свайго боку таксама робіць бюджэтныя нацэнкі на сякеркі і ў выніку яны каштуюць школе 10 руб. замест 4-5.

Ня менш агідныя, бюракратычныя адносіны да выкананьня дырэктыў партыі і ўраду праўляе і кіраўніцтва БАКТу. Намесьнік дырэктара БАКТу **Прылуцкі** проста займаецца «очковтирательством». На калегіі Наркамасьветы **Прылуцкі** запэўніў, што дагавары з прамысловасьцю на выраб палітэхнічнага абсталяваньня будуць заключаны, што БАКТ поўнасьцю забясьпечыць выкананьне заключанага з Наркамасьветы дагавору. Прашло тры месяцы, а БАКТ замест 2.100.000 руб. заключыў дагавораў з прамысловасьцю ўсяго толькі на 500 тыс. руб.

Мы прымушаны канстатаваць, што і сэктар забясьпячэньня Наркамасьветы далёка невыстарчальна рашуча змагаўся і змагаецца за выкананьне дагавору БАКТам, ён не забясьпечыў штодзённага апэрацыйнага кантролю за выкананьнем заказаў на палітэхнічнае абсталяваньне.

Прафарганізацыі працаўнікоў асьветы ня ў меншай меры вінаваты тых прарываў у справе палітэхнізацыі школы, аб якіх гаворыць у сваім лісьце т. т. **Гікало і Галадзед.** Трэба прота сказаць, што **ЦП саюзу працаўнікоў асьветы,** на прыкладу БАКТу, упаўнаркамцяжпраму, культпрамтрэсту і сампрамсаюзу **не зрабіла для сабе з гэтага ліста належных палітычных высноў.** ЦП саюзу працасьветы, у прыватнасьці яго вытворчы сэктар, ня толькі не наладзіла ніякага кантролю праз свае візаныя прафарганізацыі за вырабам палітэхнічнага абсталяваньня, але яно ў гэтай адказьнейшай галіне падрыхтоўкі да навучальнага году не аказвала і не аказвае ніякай дапамогі новаму кіраўніцтву Наркамасьветы. У ЦП саюзу працасьветы існуюць яшчэ славесна-дэкларацыйныя метады работы, ЦП не перабудавала яшчэ належным чынам сваёй работы ў адпаведнасьці з дырэктывамі сакавіцкага пленуму ЦК і менскага ГК КП(б)Б.

Мы спадзяемся, што ЦКК-НК РСІ прыцуча паложыць канец агідным, безадказным адносінам з боку арганізацый, абавязаных дапамагаць Наркамасьветы і яго органам у барацьбе за правядзеньне дырэктыў ЦК УсеКП(б) у школе. Мы маем усе падставы [illegible] ЦК КП(б)Б аб [illegible] магчымасьці забясьпечыць [illegible] палітэхнічным абсталяваньнем і яны павінны атрымаць яго да пачатку навучальнага году.

Брыгада газэт «Зьвязда» і «Зь
Коммунистическое Просвещение»
В. ЗАЙЦАЎ, Я. УЛАЗАЎ, М. ХМЫЗ.

Выпуск літоўскіх падручнікаў—гад пагрозай зрыву

Зводка ходу выкананьня стабільных падручнікаў на 29 ліпеня 1933 г.

Павінна быць надрукавана 100 падручнікаў з тыражом 2.800.000 экз.

Вышла з друку — 40 падручнікаў (з іх беларускіх—30, яўрэйскіх—7, польскіх—2, літоўскіх—1) з агульным тыражом 1.535.500 экз.

Здана ў друкарню 89 падручнікаў.

У НКА — 8 падручнікаў.

У ДВБ — 2 падручнікі.

У аўтараў — 1 падручнік.

Усяго здана на базу 29 падручнікаў з тыражом 995.372 экз.

Друкарня імя Сталіна штодзённа перавыконвае кантрольную лічбу, Палесдрук у апошнія дні здаў адзін падручнік з тыражом 40.000 экз., але яшчэ ня выконвае кантрольнай лічбы штодзённа па выпуску 10.000.

Усяго адружана на раён 26 падручнікаў з тыражом 906.731 экз. Саюзтранзкам забрана 29/VII 52.000 экз. Застаецца ўпакаваных 34.500 экз.

Загадчык вуч. пэдсэктару ДВБ
М. ДУБРАВІЦКІ.

Дзяржаўнае выдавецтва зараз пераключылася на справу выданьня праграм для пачатковай і сярэдняй школы. Зданы ў друк праграмы па геаграфіі для другога канцэнтру, частка праграм для першага канцэнтру. 29/VII здана праграма па матэматыцы, чарчэньні і фізыцы для другога канцэнтру.

Усе яшчэ вялікія прарывы з літоўскімі рукапісамі карэктурамі. Трэба прыняць меры да таго, каб на 10 дзён камандыравалі кат тав. Паўлюкевіча (рэдактар літоўскай газэты) на работу ў ДВБ. Інакш па віне ДВБ зрываецца выпуск літоўскіх падручнікаў.

Усебеларускі конкурс ССТ і міжрайбаз

Сустрэць новы ўраджай патокам тавараў

Другі этап конкурсу на лепшае сельСТ па абслугоўваньні прапалочнай, уборачнай і загатоўчай кампаній зьяўляецца адказьнейшым этапам. На працягу гэтага перыяду павінна быць канчаткова завершана перабудова работы сельСТ у адпаведнасьці з дырэктывамі партыі. Асноўнае цяпер — **убраць ураджай без страт і дэтэрміновa здаць дзяржаве збожжа, бульбу, лён і іншую прадукцыю ва ўстаноўленых нормах.** Ад сельСТ патрабуецца разгорнутым таваразваротам задавальнічаць пасьмяховаму выкананьню гэтых важнейшых, базавых задач дня. Разгарнуць развозны гандаль і сетку ларкоў, каб культурна абслужыць брыгады і калгасы непасрэдна на месцы працы.

Даклады асобных сельспажыўтаварыстваў і райспажыўсаюзаў, заслуханыя на **вызнным пасяджэньні цэнтральнай конкурснай камісіі ў Воршы,** паказваюць, што дасягнутыя ў першым этапе конкурсу посьпехі замацаваны, і рад сельспажыўтаварыстваў уключыўся ў сапраўдную барацьбу за ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых перад спажывецкай кааперацыяй.

Рудноўскае сельспажыўтаварыства, Аршанскага раёну, выканала плян таваразвароту за другі квартал на 100 проц. Для таго, каб хутка рэалізаваць тавар і забясьпечыць попыт спажыўца, праўленьне сельСТ сабрала каляўкі ад калгасаў, якія тавары патрэбны ім будуць у часе прапалочнай і ўборачнай кампаній. СельСТ заключыла саддагавары з брыгадамі і працоўнымі аднаасобнікамі на лепшае правядзеньне прапалочнай, уборачнай і загатоўчай кампаній і на лепшае снабжэньне іх таварамі пры выкананьні ўсіх абавязкаў. Адкрыты 2 новыя крамы. Разгортваньем масавай работы ССТ дабіліся выкананьня за дэкаду квартальнага пляну мабілізацыі сродкаў у разьмеры звыш 40 проц.

Заключаны з Заходнім абласным саюзам спажывецкай кааперацыі дагавор на сацспаборніцтва па лепшым абслугоўваньні поліва, уборкі і загатовак выклікаў хвалю сацспаборніцтва ў ССТ.

Роска-Сялецкае сельСТ высунула сустрэчны плян таваразвароту. Сельспажыўтаварыства замест пляну ў 50.000 руб. абавязалася рэалізаваць тавараў на 72.000 руб. Ім заключаны саддагавары з усімі калгаснымі брыгадамі. Асобныя саддагавары заключаны з жаночымі брыгадамі. СельСТ усьведаміла, што ў часе прапалочнай і ўборачнай кампаній вялізарную ролю адыгрывае грамадзкае харчаваньне. Яно арганізавала адну сталоўку і два палявыя ачагі.

Сельспажыўтаварыствы **Мсьціслаўскага раёну** заключылі 200 саддагаваро ў з калгаснымі брыгадамі. Для таго, каб лепш абслужыць калгаснікаў, у частцы калгасаў арганізаваны чайныя, якія развозяць чай у поле. Акрамя таго, арганізавана 11 развозак тавараў. Пры калгасах адкрыты 25 сталовак, якія забясьпечаны поўнасьцю інвэнтаром і начыньнем. Дзіцячыя ясьлі атрымалі 4.000 мэтраў мануфактуры, яны забясьпечаны цукеркамі і пузрам.

Такі-ж зрух ёсьць і ў Шклоўскім раёне. Трэба адзначыць, што ў часе першага этапу конкурсу нізавыя кааперацыйныя арганізацыі Тураўскага раёну амаль бязьдзейнічалі ў справе абслугоўваньня калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. Гэта прывяло да таго, што за два месяцы другога кварталу плян таваразвароту быў выкананы усяго на 54 проц. А калі ў апошнія месяцы праўленьне павярнулася тварам да калгасаў і працоўных аднаасобнікаў, ССТ удалося поўнасьцю выканаць квартальны плян таваразвароту. Гэты ўрок улічан у другім этапе конкурсу. СельСТ шырока разгарнулі работу па абслугоўваньні калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Заключана ўжо 140 саддагаваро ў з калгаснымі брыгадамі і 40 — з працоўнымі аднаасобнікамі. Асаблівая ўвага аддаецца пытаньню лепшага абслугоўваньня перадавых брыгад і лепшых аднаасобнікаў. За кароткі парыяд працы зроблена 140 выездаў з таварамі ў поле. Арганізавана 9 сталовак.

Асаблівай увагі заслугоўваюць мэтады работы Мсьціслаўскага райспажыўсаюзу. Для таго, каб уключыць і гандлёвую базу ў конкурс, каб лепш увязаць таваразпабжэньне з ходам выкананьня гаспадарча-палітычных задач, пры базе на станцыі Ходасава арганізаваны чырвоная і чорная дошкі, куды заносяцца ССТ тых сельсаветаў, якія ідуць упераадзе і якія адстаюць ва ўборцы. Паказальнікі гэтых дошак зьяўляюцца каэфіцыентам для завозу тавараў у ССТ.

З усёй рашучасьцю трэба адзначыць, што побач з перадавымі кааперацыйнымі, паасобныя райспажыўсаюзы і ССТ, як і раней, бязьдзейнічаюць і не перабудоўваюць сваёй работы. Больш таго, **некаторыя** РСС у часе прапалочнай і ўборачнай кампаній аслабілі ўзятым ў першым этапе конкурсу тэмпы. Да такіх арганізацый адносіцца **Крупскі** райспажыўсаюз. У гэтым раёне ССТ прадастаўлены самім сабе. Праўленьне Крупскага РСС кіруе працай сельспажыўтаварыства саноўна-панскімі мэтадамі. Толькі гэтым можна тлумачыць прарыў у галіне выкананьня пляну таваразвароту і ліквідацыі сродкаў у другім квартале. Гэтыя факты сьведчаць, што праўленьне Крупскага РСС нездольна ажыцьцявіць дырэктывы партыі.

З усіх дакладаў выявілася, што ў раёнах назіраецца недаацэнка значэньня насьцендруку. Нават у перадавых ССТ, дзе разгорнута вялізарная работа па абслугоўваньні прапалочнай і ўборачнай кампаній, амаль нічога не зроблена па арганізацыі насьцешнага друку.

Між тым, у першым этапе конкурсу насьцендрук адыграў вялізарную ролю ў перабудове працы ССТ.

Таксама выявілася, што асобныя райспажыўсаюзы і ССТ ігнаруюць абслугоўваньне працоўных аднаасобнікаў. Шклоўскі райспажыўсаюз усяго заключыў 40 саддагаваро ў з працоўнымі аднаасобнікамі. Такое-ж становішча ў Аршанскім раёне.

Вялізарным мінусам у абслугоўваньні прапалочнай, уборачнай і загатоўчай кампаній зьяўляецца тое, што асобныя РСС і ССТ не ўказваюць у саддагаварох канкрэтных абавязкаў як брыгад, так і сельспажыўтаварыстваў, у выніку саддагавор трацяць сваё значэньне і набываюць характар голай дэкларацыі.

Буйнейшыя памылкі, выяўленыя пры заслуханьні дакладаў на вызнным пасяджэньні конкурснай камісіі ў Воршы, павінны быць бязьдзейнічаць і не перабудоўваюць сваёй работы. Больш таго, **некаторыя** РСС у часе прапалочнай і ўборачнай кампаній асьлабілі ўзятым ў першым этапе конкурсу тэмпы. Да такіх арганізацый адносіцца **Крупскі** райспажыўсаюз. У гэтым раёне ССТ прадастаўлены самім сабе. Праўленьне Крупскага РСС кіруе працай сельспажыўтаварыства саноўна-панскімі мэтадамі. Толькі гэтым можна тлумачыць прарыў у галіне выкананьня пляну таваразвароту і ліквідац

У фашысцкай Германіі

Узмацненьне фашысцкага тэрору

БЭРЛІН, 30. (Уласн. інфарм. «Зьвязды»). У сувязі з набліжэньнем 1-га жніўня, у Германіі выбухнула новая хваля тэрору супроць рабочых.

«Мяркуючы па атрыманых абаронных групамі інструкцыях, — піша фашысцкі друк, — чакаецца «ўзмацненьне дзейнасьці камуністаў», якую інструкцыі прадпісваюць «задушаць у корані».

Пачынаючы з 20 ліпеня, супроць камуністаў пачалі ўжывацца «асабліва суровыя меры». Газэтам забаронена друкаваць весткі аб арыштах і вобысках, якія адбываюцца, «для таго, каб не ўзмацніць асьцярожнасьці антыдзяржаўных элемэнтаў».

Сьмяротныя прысуды над рэвалюцыйнымі рабочымі

БЭРЛІН, 29. (БЕЛТА). Надзвычайны суд у ГЕРБУРГ-ВІЛЬДЭНБУРГУ прыгаварыў рабочага ТРАМПЭНАЎ за ўдзел у сутычцы з штурмавікамі да кары сьмерцю. Другі рабочы прысуджан па тэй-же справе да 9 год катаргі. 4 сьведкі, выступаўшыя на працэсе на нарысьць абвінавачаных, арыштаваны.

***

БЭРЛІН, 28. (БЕЛТА). Учора «пры спробе ўцякаць» быў расстраляны камуніст, арыштаваны 27 ліпеня.

Перад фашысцкім трыбуналам

БЭРЛІН, 29. (Уласн. інф. «Зьвязды»). Дзюсэльдорфскі надзвычайны трыбунал прыгаварыў да 2-х год турмы рабочага па абвінавачаньні ў нанесеньні ран нажом гітлераўскаму паліцыянту.

Пасьля таго, як быў прачытан прыгавор, брат асуджанага кінуўся на другога паліцэйскага, выступаўшага ў якасьці сьведкі па справе, і вострым інструмантам нанёс яму цяжкую рану ў галаву.

Зьнішчэньне „дуба Гіндэнбурга" ў Бэрліне

БЭРЛІН, 28 (Белта). Упочы 28-га ліпеня невядомыя асобы сьсеклі пасаджаны ў дзень першага мая т. зв. **«дуб Гіндэнбурга»**. Дуб быў сьсечан, ня гледзячы на тое, што ён знаходзіўся пад пастаяннай аховай і быў агароджан калючым дротам. У адказ на гэта дзяржаўная тайная паліцыя загадала пазбавіць усіх зьняволеных камуністаў абеду на працягу трох дзён. У рабочых колах выказваюць упэўненасьць, што праслынуты дуб сьсечан самімі фашыстамі.

Рэвалюцыйны рух у „працоўных" лягерах

БЭРЛІН, 29. (Уласн. інфарм. «Зьвязды»). Весткі аб пашырэньні рэвалюцыйнага руху сярод моладзі ў «працоўных лягерах» усё пачанчаюцца. Рух гэты, якім кіруе германскі камсамол, зьяўляецца адказам маладых германскіх рабочых на мілітарызацыю лягераў і на іншыя «шырокія» пляны Гітлера ў адносінах гэтых лягераў.

У **Брэмэнскай** акрузе і ў **Цюрынгіі** рух гэты набыў асабліва шырокія разьмеры. У раёне **Ротэнбург-Дрэзэр** многія працоўныя лягеры напярэдадні поўнага роспуску. Лік маладых рабочых, выконваючых у лягерах заданьні, поўнасьцю фашыстаў — мінімальны. Гэта агульная зьява для ўсіх лягераў Германіі.

У адным лягеры, большасьць якога складаюць члены штурмовых атрадаў, узьніклі пратэсты ў сувязі з дрэнным харчаваньнем і ўзмоцненымі вайсковымі заняткамі. (Рабочыя ў лягеры павінны ўставаць у 4½ гадз. раніцы. Работа і вайсковыя заняткі цягнуцца да вечара).

У раёне **Ольдэнбургу** 15 дзён таму назад закрыт «працоўны лягер» таму, што рабочыя, накіроўваючыся кожную раніцу на работу, пялі «Інтэрнацыянал» і іншыя рэвалюцыйныя песьні, не зважаючы ўвагі на пагрозы іх начальства.

Яшчэ адна вэрсія аб працэсе Ван-дэр-Любэ

БЭРЛІН, 29. (БЕЛТА). Агенцтва «Вольф» пашырае афіцыёзнае паведамленьне, што ўжо ў бліжэйшы час будзе гатоў абвінаваўчы акт на справе аб падпале рэйхстагу, і што з прычыны таго, што ў абвінавачаных да гэтага часу няма адвакатаў, Вярхоўны суд назначыў афіцыяльных абаронцаў абвінавачаных. Гэта — лейпцыгскія адвакаты **Зэйфэрт, Губэр і Тэйхэрт.**

Германія рыхтуе кадры лётнікаў

БЭРЛІН, 28 (Белта). Згодна рашэньня кіраўніцтва нацыянал-сацыялісцкай партыі, члены нацыянал-сацыялісцкай арганізацыі моладзі ва ўзросьце ад 16 да 18 год у далейшым будуць паўгода навучацца «авіяцыйнаму спорту» ў 14 спэцыяльных школах.

Паралюш усёй гаспадарчай дзейнасьці Германіі

БЭРЛІН, 29. (БЕЛТА). Наперакор аптымістычным запэўніваньням нацыянал-сацыялісцкіх дзеячаў і нацыянал-сацыялісцкага друку, нават афіцыяльныя справаздачы сьведчаць аб бесспрэцэдэнтным паглыбленьні эканамічнага крызісу. Статыстыка ўніфікаваных прафсаюзаў адзначае, што беспрацоўных членаў прафсаюзаў было ў маі гэтага году 44,7 проц. супроць 43,3 проц. у маі мінулага году. Пры гэтым сярод мэталістаў беспрацоўе ўзрасло з 47,3 проц. у маі 1932 г. да 50,3 проц. у маі 1933 г.

Орган міністэрства працы паведамляе, што ў бліжэйшы час прафсаюзная статыстыка беспрацоўя ня будзе публікавацца, бо «павінна быць рэарганізавана».

Указваюць, што з 1928 па 1933 г. пазбаўлена работы 410 тысяч рабочых і служачых і што ў першым паўгодзьдзі 1933 г. беспрацоўе ў гэтай важнейшай галіне прамысловасьці ўсё ўзрастала.

Паводле даных **«Бэрлінэр Тагеблят»** сярэдні сутачны збыт каменнага вугалю ў Руры склаў у першыя 20 дзён ліпеня 164 тысячы тон супроць 170 тысяч тон у той-жа перыяд мінулага году.

На біржах амаль поўная адсутнасьць зьдзелак. Паводле апошняй месячнай справаздачы буйных банкаў, сума ўкладаў зьменшылася за гэты месяц на 60 млн. марак. У апошніх справаздачах рэйхсбанку яркa адлюстроўваецца зьмяншаючаяся патрэбнасьць у кредытах, г. зн. **паралюш усёй гаспадарчай дзейнасьці.** У першыя тры тыдні ліпеня рэйхсбанку было вернута больш кредытаў, чым ад яго было ўзята да канца першага паўгодзьдзя.

Падаткаў у першым квартале бягучага году паступіла на 71,2 млн. марак менш, чым у першым квартале мінулага году.

У чэрвені рэзка вынікла **зьнижэньне падаткаў на прадпрыемцаў і павышэньне падаткаў на масы насельніцтва.**

У той час, як паступленьні па мытах і падатках на спажываньне ўзрасьлі на 36 млн. марак, падаткі на прадпрыемцаў зьменшыліся на 27 млн. марак.

Трэба адзначыць таксама паглыбленьне аграрнага крызісу. Паданьне цэн на хлеб настолькі сур'ёзнае, што на працягу некалькіх дзён на бэрлінскай хлебнай біржы паступ зьдзелкі на жыта і пшаніцу не рэгістраваліся.

„Новыя" лініі замежнай палітыкі Манчжоў-Го

ТОКІЁ, 27. (БЕЛТА). Паводле слоў **«Сымбунг Рэнга»**, міністэрства замежных спраў **Манчжоў-Го** распрацавала «новыя лініі манчжурскай замежнай палітыкі». Сутнасьць палітыкі будзе заключацца ў наступным:

1) Супрацьлеглыя эўрапейскім і амэрыканскім эканамічным блёкам, Манчжоў-Го імкнецца стварыць «адзіны япона-кітайска-манчжурскі мытны блёк».

2) Паляпшэньне адносін з Савецкім саюзам зьяўляецца асноўным прынцыпам манчжурскай замежнай палітыкі. Аднак, калі такійскія перагаворы аб продажы КУЧ скончацца правалам, дык «Манчжоў-Го зойме рашучую пазыцыю, выходзячы з суверэнітэту Манчжоў-Го».

Павялічэньне ваеннага бюджэту Японіі

ТОКІЁ, 29 (Белта). Паводле слоў агенцтва **«Дзэнто Цусін»**, бюджэт ваеннага міністэрства Японіі на 1934-35 год вызначыцца ў суме 542 млн. іён, з якіх 216 млн. іён асыгнуецца на звычайныя расходы, 150 млн іен на маньчжурскія расходы, 125 млн. іен на ўдасканаленьне ўзбраеньня, на дадатковае ваеннае навучаньне—6 млн., на ўзнагароды ў сувязі з ваеннымі дзеяньнямі ў Манчжурыі—30 млн. іен, на вывучэньне праблемы абароны—5 млн. і, нарэшце, на судова-пракурорскія расходы—10 млн. іен.

Друк падкрэсьлівае, што ваеннае міністэрства, спасылаючыся на перажываемае Японіяй «надзвычайнае становішча» не дапусьціць урэзкі бюджэту.

***

ТОКІЁ, 29 (Белта). «Осака Май-Ніцы» указвае, што морскі бюджэт Японіі на 1934-35 год значна перавысіць бюджэт 1933-34 г. Бюджэт складае каля 570 млн. іен.

Дэмілітарызаваная зона правінцыі Хабэй у руках японцаў

ШАНХАЙ, 29 (Белта). Дэмілітарызаваная зона ў правінцыі **Хабэй** (Паўночны Кітай) па ранейшаму застаецца ў руках японскіх войск. Японскія ўлады ў **Шанхайгуане** адмовілі нават прыбыўшай кітайскай паліцыі ў дазволе выйсьці з вагонаў, і паліцэйскія вымушаны былі вярнуцца ў **Цьньвандао.** Апрача таго, японскія афіцэры патрабавалі ад кітайскіх улад, каб яны падрабязна паведамлялі аб колькасьці кітайскай паліцыі ў дэмілітарызаванай зоне, прадастаўлялі японскаму штабу копіі адміністрацыйных загадаў і г. д.

Англа-японскі канфлікт

Таямнічае судно на Эліскіх астравох

ЛЕНДАН, 29 (Белта). **З Новай Зэляндыі** паведамляюць дадатковыя даныя аб патаемным судне, якое зьявілася ў раёне брытанскіх Эліскіх астравоў у Ціхім акіяне. Судно тэта зьявілася цяпер таксама каля маленькага астраўка **Кіа** ў раёне брытанскага вострава Ванна Леву (прыкладна за 600 міль на поўдзень ад Эліскіх астравоў). Японскае судно раптам зьявілася з-за рыфаў і высадзіла на бераг каля 40 чалавек. Папоўніўшы свае запасы піцьцёвай вадой, японскія маракі ўдаліліся.

Усеагульная забастоўка чэхаславацкіх будаўнікоў

ПРАГА, 28 (Белта). Абвешчаная на 27 ліпеня ўсеагульная забастоўка будаўнікоў Чэхаславакіі прайшла з посьпехам. Ня гледзячы на паліцэйскі тэрор забастоўка ахапіла ўсіх будаўнічых рабочых **Рэйхэнбэргу, Нітры і Бэроўна. У Празе** баставалі рабочыя **32 пабудоў, у Ольмюцы—44, у Брно 11. У Братыславе, Кладно і Острове** ў знак салідарнасьці з будаўнікамі спынілі работу гарняжі і мэталісты. З вялікім посьпехам прайшла стачка будаўнікоў на **Закарпацкай Украіне. У Мукачове** будаўнічых рабочых падтрымалі рабочыя аўтатных заводаў.

Забарона Саюзу пралетарскіх бязбожнікаў у Чэхаславакіі

ПРАГА, 28 (Белта). Паліцыяй без указаньня матываў забаронен Чэхаславацкі **«Саюз пралетарскіх бязбожнікаў»**, які налічвае ў сваіх радох **30 тысяч членаў.** У памяшканьнях сакратарыяту саюзу ў **Празе і Брно** зроблены безрэзультатныя вобыскі. Памяшканьні саюзу і рэдакцыі выдаваемай саюзам часопісі апячатаны.

АНГЕЛЬСКІЯ ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКІ Ў БАРАЦЬБЕ З ПРАФСАЮЗНЫМІ БОНЗАМІ

ЛЕНДАН, 28 (Белта). Нізавыя арганізацыі прафсаюзу дрэваапрацоўшчыкаў папранейшаму вядуць актыўную кампанію супроць пастановы выканкому саюзу аб выключэньні 12 рэвалюцыйных рабочых.

Рэвалюцыі пратэсту прыняты 43 арганізацыямі і мясцовымі аддзеламі саюзу. Кампанія ахапляе ўсё новыя арганізацыі саюзу.

Прафбюракраты пагражаюць выключэньнем службовых асоб мясцовых аддзелаў саюзу ў выпадку назначэньня сходаў для абмеркаваньня пастановы выканкому.

СЁНЬНЯ, 31 ліпеня, а 6 гадз. увечары, рэдакцыя газэты «Зьвязда» працягвае

НАРАДУ

кіраўнікоў і апэрацыйных работнікаў загатоўчых арганізацый.

Просьба да ўсіх таварышоў, якія прысутнічалі на нарадзе 29-га, прыйсьці роўна а 6-ай гадзіне ўвечары.

Дадаткова запрашаем кіраўнікоў і апэрацыйных работнікаў наступных арганізацый: Саюзмукі, Насеннаводсаюзу, усіх трактарацэнтраў, Сельгасснабу, Белдзяржсьпірту і Белплодагароднікі.

„ЗЬВЯЗДА".

Сацспаборніцтва паміж БССР і Заходняй вобласьцю на хутчэйшае выкананьне фінпляну

Не дапусьціць паўтарэньня недахопаў першага паўгодзьдзя

Беларусь і Заходняя вобласьць падвялі вынікі паўгадовага сацспаборніцтва на лепшае выкананьне фінансавага пляну. Брыгады абодвух спаборничаючых бакоў па пунктах правяралі выкананьне як агульнага сацдагавору, так і сацдагавароў, заключаных паміж паасобнымі зьвеньнямі фінансавай сыстэмы.

Асноўным прынцыпам работы праверачных брыгад зьявілася не адшукальне пераможніка, а ўзаемны абмен вопытам работы, выкрыцьцё недахопаў у фінработе, выкрыцьцё прычын адставаньня на паасобных вучастках фінансавага фронту, з тым, каб у працэсе далейшай барацьбы за фінплян усе гэтыя недахопы ліквідаваць.

Па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў БССР аказалася ўпераздзе. Яна плян першага кварталу выканала на 99,4 проц. і другога — на 102,4 проц., у той час, як Заходняя вобласьць выканала плян першага кварталу на 96,5 проц. і другога — на 95,2 проц. Аднак, БССР адстала ад Заходняй вобласьці ў выкананьні дзяржпрыбыткаў, выканаўшы плян першага кварталу на 101,7 проц. і другога — на 104,7 проц., у той час, як Заходняя вобласьць адпаведна выканала пляны абодвух кварталаў на 103,1 і 106,1 проц.

Асноўнае, што забясьпечыла дасягненьне гэтых посьпехаў — гэта апэрацыйнае кіраўніцтва фінорганаў і прыцягненьне на барацьбу за фінплян грамадзкасьці. За час мінулага паўгодзьдзя як у БССР, так і ў Заходняй вобласьці значна ўзрос фінансавы актыў, чаму ў значнай ступені спрыяла правядзеньне цэлага раду масавых мерапрыемстваў, як агляд фінсэкцый саветаў, фінансавыя эстафэты, усесаюзны агляд інспэктараў дзяржпрыбыткаў, дзень пазыкатрымальніка, цэлы рад розных дэкадніка і месячнікаў і г. д.

Аднак з істотных недахопаў як з аднаго, так і з другога боку спаборничаючых зьявілася ўсё-ж недастатковае ўцягненьне ў барацьбу за фінплян шырокай грамадзкасьці, слабасьць выхаваўчай работы з фінансавым актывам, адсутнасьць належнай барацьбы за павышэньне яго кваліфікацыі.

Асабліва адстае на гэтым вучастку Беларусь. Калі ў Заходняй вобласьці ў барацьбе за фінплян прымаў актыўны ўдзел камсамол і, асабліва, жаночы актыў, дык у БССР удзел гэтай часткі актыву значна слабей: жаночы актыў у барацьбу за фінплян амаль не ўцягнуты, адстае і камсамол. Агляд фінсэкцый саветаў у БССР прайшоў даволі нявыразна і ня даў належнага эфэкту.

Значныя посьпехі дасягнуты ў правядзеньні ўсесаюзнага агляду інспэктараў дзяржпрыбытку, у выніку чаго да гэтага важнейшага вучастку фінфронту была прыцягнута ўвага грамадзкасьці і дзяржорганаў. У работу інспэктараў дзяржпрыбыткаў уцягнуты фінактыў, узмацнілася фінансавая і падатковая дысцыпліна, а ў вогуле ўсе гэтыя мерапрыемствы далі дзяржаве некалькі мільёнаў грошай, забясьпечылі выкананьне пляну па дзяржпрыбытках II кварталу і стварылі неабходныя прад пасылкі да сыстэматычных перавыкананьняў пляну ў гэтай галіне ў далейшым. За час правядзеньня агляду на прадпрыемствах было арганізавана: **па Заходняй вобласьці 276 фінансавакантрольных пастоў і ўцягнута 200 добраахвотных інспэктараў. Па БССР — 231 фінкантрольных пастоў і 147 грамадзкіх інспэктараў.**

Цэлы рад недахопаў адзначылі праверачныя брыгады ў рабоце ашчаднай сыстэмы і асабліва ў рабоце па прыцягненьню фізычных укладаў. На гэтым вучастку мабілізацыі сродкаў абодвы бакі маюць буйныя недахопы.

Уключаючыся ў барацьбу за пасьпяховае завяршэньне фінансавага пляну 1933 году, газэты: Заходняя вобласьці — **«Рабочий путь»** і БССР — **«Зьвязда»** заключылі паміж сабой сацдагавор, высунуўшы друг другу рад мерапрыемстваў, спрыяючых мабілізацыі мас на пасьпяховае выкананьне фінпляну. **У гэта спаборніцтва павінен уключыцца ўвесь раённы друк і насьценгазэты, мабілізаваць вакол сябе рабселькораў, насьценкораў і ўсю грамадзкасьць.**

Вялікім недахопам у правядзеньні сацспаборніцтва паміж БССР і Заходняй вобласьцю зьяўляецца недастатковае разгортваньне яго паміж гарадамі і раёнамі. Зусім нездавальняюча настаўлен улік выкананьня абавязацельстваў па сацспаборніцтву.

Ускрытыя ўзаемнаправераючымі брыгадамі недахопы работы фінорганаў і прамадзкасьці як у Беларусі, так і ў Заходняй вобласьці, не павінны быць выдураны ў другім паўгодзьдзі. Гэта асабліва падкрэслена на агульна-гарадзкіх сходах членаў саюзу ФВР Менску і Смаленску.

Трэці квартал зьяўляецца рашаючым у выкананьні фінпляну першага году другой пяцігодкі. У гэтым квартале перад фінансавай сыстэмай стаяць задачы. Трэба з посьпехам выканаць пляны мабілізацыі сродкаў, поўнасьцю і своечасова прафінансаваць уборачную і загатоўчую кампанію, культурна-жыльлёвае будаўніцтва і г. д. Усё гэта патрабуе ад фінансавага апарату асобай напружанасьці, належнай апэрацыйнасьці і гнуткасьці ў рабоце, шчыльнай увязкі фін. работы з бягучымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі.

Астаткі ліквідаванага, але яшчэ канчаткова недабітага клясавага ворага будуць стараццa шкодзіць і тармазіць правядзеньне нашых баявых мерапрыемстваў. Адсюль перад фінансавай сыстэмай і ўсёй грамадзкасьцю ва ўсю шырыню паўстае задача рашучага ўзмацненьня клясавай пільнасьці і няпрымірымасьці ў барацьбе з кулаком і яго агентурай.

Агульнымі намаганьнямі, аказваючы дапамогу друг другу, гэтыя спаборничаючыя бакі павінны не шукаць пераможніка, а штодзённай ўпартай барацьбой на фінфронце дабіцца аднолькавых посьпехаў.

Адставаньне аднаго з бакоў зьяўляе якасьць работы другога, а пагэтаму трэба біцца за агульныя посьпехі, адначасова і разам забясьпечыць і заваяваць першынство на СССР.

Фінагенаў, Пакроўскі.

На ўсебеларускім зьезьдзе работнікаў юстыцыі

На вячэрніх пасяджэньні 29 ліпеня адбывалися спрэчкі па дакладу наркома юста БССР тав. Кузьміна. На ранішнім 30 ліпеня працавалі секцыі: пракурорска-сьледчая, судовая, работнікаў ІПУ і старшынь грамадзкіх судоў, а ад 2-й гадзіны зноў ідуць спрэчкі. У спрэчках выступілі: т. т. Іваноў (міцебскі нарсудзьдзя), Ліўшыц (нарсудзьдзя магілеўскай яўрэйскай нацкамэры), Клюева (аршанскі пракурор), Лупачаў (полацкі пракурор), Кудзельскі (старшыня Верхсуда БССР), Калугін (ваенны пракурор), Пінкіс (начальнік шапрафа-працоўных устаноў БССР), Шлык (член Верхсуда БССР), Галаскок (старшыня лінейнага суда БССР), Клябанаў (старшыня ЦП саюзу дзяржустаноў), Кузьмін (сьледчы Чырвонапольскага раёну), Герэліи (пракурор Церахаўскага раёну), Абрамаў (нам. старшыні Верхсуда БССР), Чэрвакоў (дырэктар інстытуту судовай экспэртызы НКЮ БССР), Залатар (нарсудзьдзя Пухавіцкага раёну), нам. старшыні ЦКК-НК РСІ Конін і інш.

Усе выступаўшыя, выкрываючы недахопы ў рабоце органаў Наркамюсту, падкрэсьлілі неабходнасьць перабудовы работы так, каб яна цалкам спрыяла праваздзеньню генэральнай лініі партыі, дапамагала выкананьню ўсіх палітычна-гаспадарчых задач і захаваньню рэвалюцыйнай законнасьці ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Спыняючыся ў сваім выступленьні на неабходнасьці шчыльнай увязкі работы органаў юстыцыі з палітаддзеламі МТС і саўгасаў, начальнік палітсэктару НКЗ БССР тав. **Ратнэк** прывёў цэлы **рад** фактаў блядушна-бюракратычнай і недапушчальнай цераніны, якая мяжуе з прыступленьнем клясавай пільнасьці з боку асобных раённых устаноў юстыцыі.

У прыватнасьці, тав. Ратнэк прывёў прыклад поўнага ігнараваньня хойніцкім пракурорам Токаравым справы па вырыцьці кулацка-пікодніцкіх элемэнтаў у калгасах раёну.

— Яшчэ ў маі месяцы, — кажа тав. Ратнэк, — пракуратуры былі перададзены дзьве справы аб масавым упадку жывёлы ў калгасах (за красавік і май па трох калгасах раёну загінула 30 коняй, 16 кароў, 12 пт. маладзьняка) і па гэтых справах з боку хойніцкай пракуратуры ніякіх мер ня ўжыта.

***

Пасьля закрыцьця пасяджэньня зьезду калегія НКЮ на экстраным пасяджэньні разгледзела факт вялебнай адносін да сваіх абавязкаў хойніцкай пракуратуры і нарсуда, аб чым гаварыў у сваім выступленьні на зьезьдзе тав. Ратнэк, і пастанавіла зьняць з работы хойніцкага пракурора **ТОКАРАВА і забараніць на працягу двух год працаваць у органах Наркамюсту, а нарсудзьдзі абвясьціць вымову.**

Разам з гэтым калегія НКЮ папярэдзіла ўсіх работнікаў юстыцыі, што ў далейшым падобныя фармальна-бюракратычныя адносіны з боку пракурорска-сьледчых органаў да наладжаньня сувязі з палітаддзеламі і няпрымяненьне мер да тэрміновага разгляду справ будуць разглядацца, як крымінальнае злачынства і вінаватых прыцягвацца да суровай адказнасьці.

***

На вячэрнім пасяджэньні зьезду, з вялікай прамовай аб задачах работнікаў юстыцыі спатканы бурнымі апладысмэнтамі, выступіў нам. пракурора Саюзу ССР тав. ВЫШЫНСКІ.

Адкрылася ўсебеларуская нарада работнікаў нарасьветы

29 ліпеня адкрылася скліканая Наркамасьветы ўсебеларуская нарада загадчыкаў райана, дырэктароў пэдагагічных навучальных устаноў. У рабоце нарады прымае ўдзел звыш 300 чалавек.

У першы дзень нарада заслухала даклад наркома асьветы БССР тав. ЧАРНУШЭВІЧА аб выніках 1932-33 навучальнага году і падрыхтоўцы да новага навучальнага году.

У спрэчках па дакладах т. ЧАРНУШЭВІЧА выказалася 26 чалавек. Нарком зямляробства БССР т. БЭНЭК выступіў з дакладам аб задачах культасьветных устаноў ва ўборачнай і загатоўчай кампаніях.

Паведамленьне

Партканфлікт ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 1-VIII у г. Слуцку партпрыйкай ЦКК КП(б)Б будуць разгледжаны партсправы наступных таварышоў Капыльскага раёну: **Куцалай Я. А., Нядзельна М. В, Брэзін М. С., Паўлюшчык, Гончар, Высоцкі Р. М., Пілічык П. Р., Рыкаўскі Я. К., Стульба, Кацілаў М. К., Сьбен М. П., Гетманчык, Бабеня, Асе Э. Х., Заньковіч В. А., Рассаднёў П. М., Гаражон Г. М., Гурына П. Т., Салагуб А. С.**

Яўка памянёных таварышоў абавязкова

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ КІРАЎНІЦТВА ДАМЭЦ гор. Масква

Гарадзкі сад Дзяржцырк —ПАШТО.

СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА

вялікая праграма

Атракцыёны ТРЫО ФАБРЫ—жанглёры на кані.

Нямецкі атракцыён цы клістаў - вялёсапэдыстаў ПАЎЛЬТОН і ДОЛЛЕЙ.

Удзельнічае ўся трупа.

Продаж білетаў у рабочай касе з 12—2 і з 4—8, а ў касе цыркку з 12—3 і з 6 гадз. вечара.

ПАЧАТАК у 9 гадз. вечара.

ДЗІЦЯЧЫ ГУЛЬНЫ кіно-тэатр

Ад 26 ліпеня БАМБІСТ

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 1 г. дня.

Прыгодніцкі фільм ЖАХ у ПУСТЫНІ доўма ў 7 частках.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ

Замежны настацкі фільм Небясьпечны ўзрост драма ў 6 частках.

„ПРАЛЕТАРЫ"

Пат і Паташон у кам. ЗАГАДКА МЛЫНУ

„СПАРТАК". Каса—з 3 г. 30 м.

Замежная камэдыя ХРЫЗАНТЭМА ў 6 частках

ЧЭРЫКАЎСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ

ПАВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР

на першы курс тэхнікуму і на 9-ці месячныя ветфэльчарскія курсы.

На першы курс прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодку, а на ветфэльчарскія курсы—з ведамі ў аб'ёме 5—6 год сямігодкі.

Студэнты і курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй, сталоўнай і інтэрнатам.

Прыём заяў па 15 жніўня, з 25 жніўня па 1 верасьня. —Іспыты па беларускай мове, грамадазнаўстве матэматыцы, фізыцы і хіміі.

Да заявы прыкладаюцца дакумэнты (у арыгіналах): аб сацыяльным паходжаньні, аб адукацыі, аб узросьце, аб здароўі і зьясьнёвальная анкета.

Заявы з дакумэнтамі і 40 кап. маркамі накіроўваць па адрасу: гор. Чэрыкаў, ветэхні-ум.

Дырэкцыя.

Усесаюзнае акцыянэрнае т-ва „ИНТУРИСТ"

даводзіць да ведама грамадзян, якія апляцілі у свой час праз А-О „РУСКАПА" або „Совторгфлот" шыфкарты (эмігрантскія „прыпейды") на праезд з заграніцу і атрымалі адмову ў выдачы ім замежнага пашпарту, што ў сучасны момант яны могуць зноў узбудзіць хадайніцтва аб дазволе ім выезду на пастаяннае жыхарства заграніцу.

Усе даведкі можна атрымаць у праўленьні В-А-О „Интурист"—г. Масква ул. Горького 11, гостин. „Национаць" або ў яго канторах у г. г. Ленінградзе, Харкаве, Адэсе, Кіеве, Менску, —Камсамольская вул. № 20.

В-А-О „ИНТУРИСТ".

Дрыбінскі дзяржаўны тэхнікум СЬВІНАГАДОЎЛІ,

які знаходзіцца ў веданьні НАРКАМСАЎГАСАЎ,

абвяшчае набор студэнтаў

на 1 курс у ліку 90 асоб.

Прыём заяў да 15-га жніўня. Іспыты з 15 да 25-га жніўня абавязковы для ўсіх паступаючых па беларускай мове, грамадазнаўству, матэматыцы, фізыцы і хіміі у аб'ёме ШКМ. Да заяў павінны быць прыкладзены дакумэнты ў арыгіналах: аб адукацыі, аб нараджэньні, сацыяльнае становішчы, аб здароўі, аб выбарчых правах, засьведчаная анкета і дзьве фотакарткі. Прымаюцца ва ўзросьце ад 15 да 30 год.

Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і падручнікамі.

Дырэкцыя.

Менскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум (былы палітэхнікум)

паведамляе ўсіх падаўшых заявы для паступленьня ў тэхнікум, што іспыты адбудуцца з 1-га верасьня г. г. Іспыты будуць па матэматыцы, грамадазнаўству і беларускай мове ў аб'ёме 7-гігодкі. Аб дапуску да іспытаў і часе іх будзе паведамлена кожнаму асабіста. Прыём заяў працягваецца да 15-га жніўня.

Дырэкцыя.

Дзяржтрэст „Белкамунснаб" пры Наркамгасе БССР

даводзіць да ведама ўсіх спажыўцоў, што ён у адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 7-IV—33 г.

прыступіў да збору ЗАЯВАК на СУПРОЦЬПАЖАРНАЕ АБСТАЛЯВАНЬНЕ на 1934 год.

ПАРАДАК ПАДАЧЫ ЗАЯВАК НАСТУПНЫ:

Наркаматы—НКЦП, ВПО АДПУ, НКЛП, НКЛес, НКСнаб, НКЗамежгандаль, НКПС, НКВод, Цудартранс, Наркамсаўгасаў, Наркамзем (калгасы, МТС і інш.), Цэнтрасаюз і органы АДПУ падаюць заяўкі для ўсёй сваёй сыстэмы у цэнтралізаваным парадку непасрэдна сваім цэнтрам у Маскву па форме, апублікаванай у газэце «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» ад 22-VII—33 г. № 181.

Астатнія цэнтральныя варыяматы і аб'яднаньні—гарсаветы, райвыканкомы, НКАховы Здароўя, НКАсьветы, НКФін, прамка апэрацыя, жыллаапэрацыя і усе іншыя для ўсёй сваёй сыстэмы падаюць заявукі ім на наступнай форме.

Назва ведамства _____

Дакладны адрас і № тэлефону _____

НАМЭНКЛЯТУРА	АГУЛЬНАЯ ГАДАВАЯ ПАТРЭБНАСЬЦЬ	ЦАНА	СУМА

Апошні тэрмін прыёму заявак 20 жніўня г. г. Пасьля указанага тэрміну заявукі і да датні да іх прымацца ня будуць.

За усякі тлумачэньнямі і даведкамі зварачацца: гор. Менск. Інтэрнацыянальная № 8. Белкамунснаб.

ДЗЯРЖТРЭСТ „БЕЛКАМУНСНАБ".

Сэктар кадраў НКФ БССР абвяшчае асеньні НАБОР студэнтаў

на 1 курс ашчаднага адзяленьня Віцебскага фінансава-эканамічнага тэхнікуму.

Віцебскі фінансава-эканамічны тэхнікум рыхтуе эканамістаў-бухгальтараў, кіруючых работнікаў рахунковага апарату горрайашчэдкас і эканамістаў-арэдытнікаў, на пасады інспэктараў ашчадкасы сыстэмы. Тэрмін навучаньня 3 гады.

Прыём заяў— да 15 жніўня.

Іспыты—з 25 жніўня па грамадазнаўству, матэматыцы, фізыцы, хіміі і беларускай мове ў аб'ёме курсу сямігодкі. Да заяў патрэбна прыкласьці наступныя дакумэнты (у арыгіналах): засьведчаную анкету, спраўку аб узросьце, аб адукацыі, аб сацыяльным становішчы і паходжаньні (для сялян-адзінаасобнікаў—даведку аб с-г. падатку за 1933 г.), даведку аб здароўі, 2 фотакарткі і марак на 40 к. для адказу. Залічэньня поўнасьцю забясьпечваюцца інтэрнатам. Ступэндый забясьпечваюцца ў залежнасьці ад паспяховасьці на агульных падставах. Заняткі пачнуцца 1 верасьня г. г. Заявы накіроўваць: Віцебск, вул. Вялаарскага 29, фінвучэбнаму тэхнікуму.

Сэктар кадраў НКФ БССР.

БЕЛГАЛОЎСЬПІРТ

абвяшчае, што з 1-га жніўня па 15-га верасьня 1933 году будзе праводзіцца прыём ЗАЯВАК

ад аб'яднаньняў, арганізацый беларускага рэспубліканскага і мясцовага значэньня НА ВОДПУСК СЬПІРТУ для тэхнічных, медыцынскіх і іншых патрэб на 1934 г.

У заяўках указаць сорт і колькасьць патрэбнага сьпірту ў дэкалітрах безводнага альнагалю, назва прадпрыемстваў, іх месца знаходжаньня і рэквізыты. Да заявак неабходна дадаць тэхнічны ўгруп таваных разьлікі патрэб сьпірту. Заяўкі накіроўваць па адрасе: г. Менск. Рэвалюцыйная 3, Белгалоўсьпірт, сьпіртавому сэктару.

Пасьля 15 верасьня г. г. заяўкі прымацца ня будуць.

Беларускія аб'яднаньні, арганізацыі ўсесаюзнага значэньня, якія маюць раз галімаваную прэфэрэнцыю, заяўкі наўпрост роўнаюць непасрэдна сваім усесаюзным аб'яднаньням і арганізацыям для ўключэньня апошніх у цэнтралізаваны заяўкі Галоўсьпірту ў Маскве.

Белгалоўсьпірт, сьпіртавы сэктар.

ІНСТЫТУТ МАСАВАГА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАНЬНЯ ПАРТАКТЫВУ пры ЦК КП(б)Б

Расклад радыёперадач на жнівень месяц 1933 году.

(Перадачы інстытуту вядзьвяюцца праз Менскую Радыёстанцыю імя СНК БССР, РВ—10, на хвалі 1105 метраў).

Час перадач ПА ЧОТНЫХ ЧЫСЛАХ—з 18 гадзін 30 мін. да 19 гадз. 30 мін. —ПА НЯЧОТНЫХ ЧЫСЛАХ—з 21 гадз. да 22 гадзін

Інстытут Масавага Завочнага Навучаньня прадаўжае ў жніўні перадачу па радыё для шырокага партыйнага, камсамольскага і беспартыйнага актыву калгасаў, саўгасаў, МТС і гораду: 1) вучэбных лекцый прысгасоўна да праграм сыстэмы завочнай партвучобы 2) эпізадычных цыкляў і 3) масавых лекцый на пытаньнях бягучай палітыкі партыі і міжнароднага становішча.

I. Завочны Камвуз
Палітэканомія.
I КУРС
4-VIII — „Заработная плата".
УВАГА! Завочнікі 1-га курсу Камвузу новага набору слухаюць лекцыі па-палітэкамомі 8 і 22 жніўня.
ГІСТОРЫЯ РАСП і СССР
I КУРС
2-VIII — Сялянскія рухі 50-60 г. г. як першы крок на шляху да буржуазнай манархіі (паўтарэньне).
II КУРС
14-VIII — „Палітычныя партыі і аграрнае пытаньне ў рэвалюцыі 1905-1907 г. г."
28-VIII — „Дзяржаўны пераварот 3-га чэрвеня 1907 г." (сталыпінская рэформа).
ГІСТОРЫЯ УСЕКП(б)
II КУРС
28-VIII — „Бальшавікі на міжнародзнай арэне" (да